ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 316 (4222)
Аўторак, 24 лістапада
1931 г.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Разьмеркаваньне даходаў — важнейшае зьвяно арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў (1 стар.). В. БОЛЬСКІ — Завязаць вышыні пралетарскага мастацтва (3 стар.).

РЭЗАЛЮЦЫІ АБ'ЯДНАНАГА ЛІСТАПАДАЎСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК КП(б)Б (1-2 стар.).

Міжнародны пралетарыят — на варце СССР (1 стар.).

Выразнае апарацыйнае кіраўніцтва разьмеркаваньнем даходаў у калгасах (2 стар.).

З большавіцкай непрыміральнасьцю змагацца супроць праяўленьняў вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму (3 стар.).

Калгасы павінны паказаць прыклад узорнага выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай (3 стар.).

КІТАЙ: Агатыты ваенных акупантаў расьцуць (4 стар.).

Разьмеркаваньне даходаў—важнейшае зьвяно арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў

Разьмеркаваньне даходаў у калгасах ставіцца адным з важнейшых зьвеньняў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, цэнтральнай ланкай развіцьця руху па даным этапе. Аб гэтым гаворыцца: «Правільнае разьмеркаваньне даходаў і ўмацаваньне на гэтай аснове эканомічнага ўкладу калгасаў — вырашальнае ўмова ліквідацыі і ўзмоцненьня ўжо дасягнутага поспеху ў калгасным будаўніцтве і далейшага ажыцьцяўленьня і ўзмацненьня калгаснага руху. Толькі правільнае і прапільнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах замацуе дысцыпліну, узьнімае працудзельнасьць працы, павялічвае таварнасьць калгаснай гаспадаркі і палепшае матар'яльнае і культурнае становішча калгасьнікаў».

Рэшта гэтай пастановы на ўсіх калгасах, за 15-ю кастрычніка павінны быць складзены пашпарэцкія праекты і калгасьнікам выданы авансы ў адпаведнасьці з выпрацаванымі праектамі ў памеры 50 проц.

Правільнае складаньне праектаў, своечасовая выдача авансаў паслужылі адпаведным стымулам таго, што рад калгасаў з посьпехам справіліся з восенскай, сваячасова выканалі плян сяўбы, змаглі дзяржаве тавараную прадукцыю, а некаторыя з іх ужо скопілі прадукцыю і здаду дзяржаве тэхнічных культур.

У рэзультаце перавозу калгасаў на вялікім, механізацыі — завозу трактараў і складаных сельгасмашын — мы маем рост даходнасьці калгасаў і палепшаньне дабрабыту калгасьнікаў.

Многія калгасы поўнасьцю выканалі свае абавязацельствы перад прадпрыемствамі і, ня гледзячы на вялікія капітальныя затраты і адлічэньні ў пасевны фонды на наступны пасеўны плошчы ў 1932 г., яны павялічваецца ў некаторых калгасах на 40-50 проц., калгасьнікі забяспечылі сябе выстарчальнай кормавай харчоў і грашыма.

Здавалася, што ўсе раённыя калгасна-земельныя арганізацыі і калгасьнікі павінны былі-б уцяшацца за разьмеркаваньне даходаў, як асноўнае звяно арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Адная, даныя гавораць, што ў раёнах раёнаў і калгасаў гаспадарча-палітычная важнасьць разьмеркаваньня даходаў недаацэньваецца і ўказаньні *дырэктыўных органаў на выконваць-*

ня. На 15-га лістапада *склалі пашпарт*ныя праекты 64,6 проц. калгасаў, а выдалі авансы калгасьнікам **60,03** проц. калгасаў. Аб чым гаворыць гэты лічбы? Яны гавораць аб грубым ігнараваньні дырэктыў партыі, недаацэнцы разьмеркаваньня даходаў, як важнейшага зьвяна арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у некаторых раёнах.

Апортуністычная боязьнь выдачы авансаў калгасьнікам, затрыманьне іх вядзе да падрыву арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, аказвае непасрэдную паслугу кулаку.

Апрача таго, частка праўленьняў калгасаў выдала авансы без складаньня праектаў. Такім чынам працадні не вылічаны і невядома, колькі каму прыпадае. Ясна, што такая выдача авансаў праводзіцца на дрыгнцкае ґрунтаўлаўкі. Няма сумненьня, што гэта ня што апортуністычная практыка ідзе ўразрэз з дырэктывамі партыі, рэсхіствае працасьпыліну ў калгасах, бо на сьвядомай частцы калгасьнікаў і дае магчымасьць тультаю лажыць за жэшт чужой працы.

Сакацёк і адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай важнейшай кампаніяй з боку некаторых раённых і калгасна - земельных арганізацый дае вусім спрыяючую глебу для работы кулацкіх агентаў, якія імкнуцца праціягнуць у калгасы «лявацкую» ўраўнілаўку і гэтым самым сарваць арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Вакол разьмеркаваньня даходаў разгортваецца клясавая барацьба. Кулак, граючы на ўраўнілаўцы, імкнецца сарваць выдзельшчыну, агітуе за разбазарваньне таварнай прадукцыі і дабіваецца зьніжэньня прадукцыйнасьці працы ў калгасах. У некаторых калгасах, засьмечаных клясава - чужым элементам, гэтага яму ўдалося дабіцца. Мы маем у асобных калгасах нязначную грашовую частку для разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі, а жыве-ні-жыве грашовая частка зусім адсутнічае. Пры разьмеркаваньні даходаў уся гэта кулацкая палітыка ўскрылася. Апартуністычныя элементы, здзюстроўваючы імкненьні кулака, не жадаюць укараняць выдзельшчыну ва ўсе галіны сельскай гаспадаркі, рацыянальнай у той час, як для гэтага ёсьць усе магчымасьці.

Партыйныя арганізацыі павінны памятаць, што недаацэнка разьмеркаваньня даходаў ёсьць простае апартуністычнае ігнараваньне задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

ЦК КП(б)Б сваёй пастановай ад 10 лістапада адзначаў, што «партыйная арганізацыя яшчэ не пераключылася на вырашэньне па-баявому асноўнай задачы, якая стаіць перад партарганізацыяй у калгасным будаўніцтве, — гэта на арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў у іх сучаснай арцельнай форме. ЦК прапануе ўсім партыйным арганізацыям паставіць у цэнтры сваёй работы і канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва выкананьне гэтай асноўнай задачы».

Гэта пастанова абавязвае ўсе раённыя арганізацыі ўмацца па-баявому за ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы калгаснага руху — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і аднаго з важнейшых зьвеньняў — разьмеркаваньне даходаў на працоўным прынцыпе.

Усякія праяўленьні апартуністычнай ідэалізацыі калгасаў, якія выкажуць з недаацэнкі элементаў клясавай барацьбы, з патуранньня кулаку

навінны атрымаць рашучы адпор. Адначасова бальшавіцкі адпор павінны атрымаць усялякія спробы «левакоў» ахапіць калгасны рух, яго посьпехі, яго дасягненьні.

Палажыўшы ў аснову сваёй работы 6 умоў тав. Сталіна, мабілізуючы масы калгасьнікаў, раённыя арганізацыі павінны павесьці рашучую барацьбу з дапушчанымі скрыўленьнямі пры практычным разьмеркаваньні даходаў, дабіваючыся канчатковай ліквідацыі ўраўнілаўкі, абязьлічкі, падзёншчыны і дзючы руйнуючы адпор кулацкім спазыцыцкім тэндэнцыям.

Задачы, якія паставіў апошні пленум ЦК КП(б)Б у галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, мы можам і павінны з посьпехам ажыцьцявіць.

Руйнуючы супраціўленьне кулацтва, бязьлітасна змагаючыся з яго агентамі — правымі і «левымі» апартуністамі, даб'ёмся перамог у арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў!

МІЖНАРОДНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТ НА ВАРЦЕ СССР

Адозва францускага камсамолу

ПАРЫЖ. Орган францускага камсамолу «Авангард» апублікаваў адозву францускага камсамолу да салдат, маракоў і працоўнай моладзі. Адозва заклікае да «АБАРОНЫ СССР і БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ МАХІНАЦЫЙ ФРАНЦУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ НА ДАЛЕКІМ УСХОДЗЕ».

Падкрэсьліваючы, што толькі актыўнасьць рабочых мас можа прымусіць імпэрыялістаў адмовіцца ад задуманага паходу на СССР, адозва звяртаецца да ўсіх моладзых рабочых незалежна ад іх палітычных поглядаў і ў прыватнасьці звяртаецца да сацыялістычнай моладзі з заклікам да масавых дэманстрацый пратэсту супроць новай вайны і да стварэньня адзінага фронту барацьбы за недапушчэньне патрабчанньні. Гэтыя дэманстрацыі пратэсту загартуюць рабочую моладзь для барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны.

Напамінаючы салдатам і мараком аб тым, што нітайскія пралетары зьяўляюцца іх братамі па клясу, адозва заклікае іх адмовіцца ад ролі катаў у адносінах да рабочых і сялян Кітаю і Індо-Кітаю і адмаўляцца ад таго, каб стаць «антысавецкімі жандарамі».

Адозва заклікае заняцца да ўсіх ладных рэвалюцыйных рабочых з прапановай дабіваецца НЕАДКЛАДНАГА ЗВАРОТУ ФРАНЦУСКАЙ ЭСКАДРЫ З КІТАЮ І АДКЛІКАНЬНЯ САЛДАТ І МАРАКОЎ, ЯКІЯ ФРАНЦУСКІ ІМПЭРЫЯЛІЗМ ПАСЛАЎ НА ДАЛЕКІ УСХОД.

На абароне Савецкага Саюзу

ПАРЫЖ, 22. «Юманітэ» паведамляе, што парыскі камітэт францускай кампартыі склікае на 1-га сьнежня масавы мітынг супроць вайны на Далёкім Усходзе і за абарону СССР. Адбыўся рад сходаў, скліканых «таварыствам прыяцеляў СССР» і прысьвечаных барацьбе супроць ваеннай небясьпекі, абароне СССР і кітайскіх савецкаў.

На барацьбу супроць падпальшчыкаў вайны

ЛЕНДАН. «Дэйлі Уоркер» публікуе адозву палітбюро ангельскай кампартыі з заклікам працоўных змагацца супроць падпальшчыкаў вайны, стаць на абарону Савецкага Саюзу і патрабаваць выраду ангельскіх войск з Кітаю.

«Барацьба імпэрыялістычных дзяржаў за новы падзел Кітаю, — гаворыцца ў адозве, — адбываецца адначасова з непасрэднай падрыхтоўкай інтэрвэнцыяністкай вайны супроць СССР. Новы напад на Кітай набліжае небясьпеку новай сусьветнай імпэрыялістычнай вайны. Савецкі Саюз не падпадае ні на якія правакацыі і цьвёрда праводзіць палітыку міру.

Капіталістычны друк, сьледуючы прыкладу ангельскага ўраду, падтрымлівае Японію. Аднагасова японскіх імпэрыялістаў падтрымлівае міжнародная сацыял-дэмакратыя, начыпаючы ад левага і канчаючы правым не фляніраў. Толькі рабочая клясе зможа палажыць канец вайне. Падзел Кітаю, поўная сусьветная імпэрыялістычная вайна і інтэрвэнцыяністкая вайна супроць СССР — усё гэта залежыць ад барацьбы рабочае клясы за зьвяржэньне капіталізму».

Адозва аўстрыйскай кампартыі

ВЭНА, 22. Орган аўстрыйскай камуністычнай партыі «Ротэ Фанэ» публікуе адозву аўстрыйскай кампартыі да рабочых і сялян, у якой яна заклікае іх арганізаваць кампанію масавага пратэсту супроць ваенных правакацый японскіх і іншых імпэрыялістаў і стварыць камітэты абароны Савецкага Саюзу.

(ТАСС).

АБ РАБОЦЕ МББ, ЗАХОДНІХ ЧЫГУНАК І ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ І РЭАЛІЗАЦЫІ ДЫРЭКТЫЎ ЦК УсеКП(б)

Пастанова аб'яднанага лістападаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б па дакладах дырэкцыі МББ, Заходніх чыгунак, воднага транспарту і судакладу ЦКК-РСІ

Заслухаўшы даклады дырэкцыі МББ і Заходніх чыгунак і судакладу ЦКК-РСІ аб рабоце чыгунак і правядзеньні дырэктыў ЦК УсеКП(б) (адозва ЦК УсеКП(б) ад 10 студзеня 1931 г., пастанова чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б канстатуе, што пры праяўленьні некаторых пазітыўных палепшаньняў у рабоце чыгунак важнейшыя пастановы ЦК УсеКП(б) яшчэ не выкананы і работа чыгунак затасоўваецца неадкладнымі.

Партыя ня можа дапусьціць у якой-небудзь меры паўтарэньня зімоўных перабояў у рабоце чыгунак. ЦК будзе лічыць мясцовыя партарганізацыі адказнымі за крарывы ў рабоце транспарту на тым ці іншым вучастку. Увага ўсёй партыі і мясцовых партарганізацый павінна быць шчэ ў большай меры сканцэнтравана на далейшай мабілізацыі мас чыгуначнікаў для палепшэньня работы цягніка, вагона, для павышэньня якасьці рамонту, для палепшэньня работы станцыі, для ўмацненьня працдысцыпліны, для рашучага палепшэньня работы апарату кіраўніцтва, для барацьбы з косьнасьцю і бюракратызмам. Павінна быць забясьпечана рашучая барацьба за беражлівае скарыстаньне транспартных сродкаў, вагонаў і цягнікоў, скарачэньня ўсякіх прастояў пад нагрузкай і выгрузкай. Неабходна штодзённая праверка і ўмацненьне выкананьня заказаў транспарту прамысловымі прадпрыемствамі і палепшэньне якасьці іх прадукцыі.

(З рэзалюцыі кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б).

1. Спаранная ядра на паравозах праводзіцца яшчэ ў значнай меры фармальна, адсутнічае сапраўды бальшавіцкая барацьба са зрывамі спаранай ядры і прычынамі, якія іх выклікаюць, іменна дрэнная арганізацыя выклікі брыгад, адсутнасьць графікаў работы паравозных брыгад, адсутнасьць настаўнічага прымацаваньня і здачы паравозаў па актах, а таксама частыя масавыя перакідкі паравозаў (па дэпо Віцебск за 2-ю палову кастрычніка — 213 зрываў, або 11,61 проц. зрываў, на Жлобіне ў верасьні хадзіла 7 абязьлічаных паравозаў).

У мэтах сапраўднага замацаваньня спаранай ядры і безагаворачнага выкананьня дырэктывы партыі аб павялічэньні сутачнай работы паравозаў на менш чым на 1 гадзіну, пленум ЦК і ЦКК абавязвае дырэкцыі чыгунак, гаспадарчыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі раёнаў у найкарацейшы тэрмін зьвяніцьць усе адначаныя недахопы ў правядзеньні спаранай ядры, цьвёрда і рашучэ правесьці ў жыцьцё загад т. Андрэева.

2. Ліквідацыя абязьлічкі ў вагонным парку — прымацаваньне наўных паркаў да чыгунак і арганізацыя абменных і рамонтных пунктаў праводзіцца недапушчальна слабым тэмпам. Замест энэргічнага ажыцьцяўленьня гэтай важнейшай дырэктывы ў радзе выпадкаў існуе самацёк і ствараецца простая пагроза невыкананьня загаду т. Андрэева аб ліквідацыі абязьлічкі вагонаў у вызначаны тэрмін.

Аб'яднаны пленум прапануе дырэкцыям чыгунак не пазьней 20 лістапада закончыць арганізацыю абменных і рамонтных пунктаў, забясьпечыць іх механічным абсталяваньнем, запасьнымі часткамі, а таксама неабходнымі кваліфікаванымі кадрамі, службовымі і жыльлёвымі памяшканьнямі.

3. У выніку нездавальняючага правядзеньня спаранай ядры, невыстарчальнай адказнасьці паравозных брыгад, а асабліва дрэнная якасьці рамонту паравозаў і вагонаў, процант хворых паравозаў і вагонаў застаецца яшчэ высокім (асабліва ў дэпо Віцебску). У мэтах рашучага зьніжэньня процанту хворых паравозаў і вагонаў пленум ЦК і ЦКК прапануе дырэкцыям чыгунак і начальнікам раёнаў бездакладна наладзіць правільнае плянаваньне ўсіх вытворчых працэсаў, правільна расставіць рабочую сілу па рамонце паравозаў і вагонаў, забясьпечыць спабжэньне дэпо неабходнымі запаснымі часткамі, разгарнуўшы сапраўды бальшавіцкую работу на мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Дырэкцыі Заходніх чыгунак загрузіць завод Ланцуцкага для вырабу запасных частак, забясьпечыўшы яго адчаведнымі матар'ялам.

4. У эксплёатацыйнай рабоце транспарту не відзець рашучай барацьбы з косьнасьцю і непаваротлівасьцю, з апартуністычным самацёкам, няма даволі выразнага камандаваньня, у выніку эксплёатацыйная работа на ўсіх раёнах БССР зьяўляецца яўна недазвольнаючай: няма выразнай работы дыспэтчарскага апарату і станцыйных агентаў, асабліва на разьмеркавальных і вузлавых станцыях, дрэнна пастаўлена плянаваньне як перыядычнае, так і апэрацыйнае па грузавых перавозках, нізкі процант сьледжаньня таварных цягнікоў на раскладзе і што асабліва недапушчальна — вялікі процант спазьненьняў пасажырскіх цягнікоў.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК абавязвае дырэкцыі чыгунак і раёны забясьпечыць поўнае правядзеньне загаду т. Андрэева аб маршрутызацыі і спэцыялізацыі цягнікоў, палепшыць плянаваньне, укамплектаваць адпаведныя групы ў дырэкцыях і раёнах, бездакладна ўстанавіць стандартныя нормы прастою і дасканалы расклад падачы і ўборкі вагонаў. Дырэкцыям чыгунак у дадны тэрмін узмацніць аддзелы эксплёатацыі раёнаў і дыспэтчарскі апарат, рэзка павялічыўшы партыйную праслойку сярод работнікаў эксплёатацыі. Пленум даручае бюро дадаткова мабілізаваць партыйна-камсамольскую групу работнікаў для узмацненьня эксплёатацыйнай работы чыгунак.

5. Асабліва недапушчальнай аб'яднаны пленум лічыць зацяжку і перашучасьць у правядзеньні пастановы партыі аб арганізацыі працы і ліквідацыі «лявацкай» ураўнілаўкі ў заработнай плаце. З боку гаспадарнікаў і прафсаюзных арганізацый на транспарце праяўляецца яўная недаацэнка рашучай важнасьці правядзеньня прагрэсыўна-здзельнай і прэміяльнай аплаты працы ва ўсіх зьвеньнях.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК катэгарычна абавязвае гаспадарчыя, прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі на транспарце бездакладна ажыцьцявіць дырэктыву аб арганізацыі працы, ліквідацыі ўраўнілаўкі і правядзеньні прагрэсыўна-здзельнай і прэміяльнай аплаты.

6. Становішча працоўнай дысцыпліны ўсё яшчэ застаецца нездавальняючым. Гаспадарчыя, прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі не вядуць належнай барацьбы з парушэньнямі працоўнай дысцыпліны, шырокія масы рабочых не мабілізуюцца на барацьбу з кожным асобным выпадкам парушэньня як з боку рабочых, так і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу. Слаба праводзіцца прэміраваньне лепшых ударнікаў. Невыстарчальна ўкаранена сапраўдная адказнасьць выканаўцаў за даручаную работу, няма рэгулярнай і настойлівай праверкі выкананьня. Адным з вынікаў такога становішча з працоўнай дысцыплінай зьяўляецца значная колькасьць здарэньняў.

Пленум ЦК і ЦКК ставіць перад партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі на транспарце задачу рашучай барацьбы за працоўную дысцыпліну, як адну з важнейшых і асноўных задач.

7. Гаспадарчы разрахунак, як асноўны вагар правільнай арганізацыі гаспадаркі, і скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў на ўсіх раёнах і асобных гаспадарчых зьвеньнях фактычна адсутнічае. З боку раду гаспадарнікаў назіраецца простае апартуністычнае процідзеяньне і ігнараваньне гаспадарчага разрахунку.

Пленум ЦК і ЦКК абавязвае дырэкцыі чыгунак, раёны, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі забясьпечыць сапраўднае правядзеньне гаспадарчага разрахунку ва ўсіх зьвеньнях не пазьней чым да 1-і 1932 г. Прыняць рашучыя меры па эканоміі апалу. Дырэкцыям чыгунак і начальнікам раёнаў спусьціць ва ўсе нізавыя зьвеньні нарады-заказы і трансфінпляны, арганізаваць улік работы на ўсіх зьвеньнях.

Дырэкцыям чыгунак настойліва дабівацца перад НКПС тэрміновага выраўнаньня ўсіх цытаньняў, зьвязаных з правядзеньнем гаспадарчага разрахунку.

8. Транспартная каапэрацыя яшчэ не спраўляецца з ускладзенай на яе задачай па бесьперабойным забясьпячэньні рабочых, пашырэньні і палепшэньні грамадзкага харчаваньня, максымальным скарыстаньні мясцовых харчовых і прамтаварных рэсурсаў. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК прапануе ўсім каапэрацыйным арганізацыям зьвярнуць якія-б там ні было перабоі ў спабжэньні рабочых транспарту, палепшыць грамадзкае харчаваньне, зьвярнуўшы асабліву ўвагу на разгортваньне мясцовых загатовак. Абавязаць Наркамснаб і Белкаапсаюз аказаць максымальную дапамогу транспартнай каапэрацыі, не дапушчаючы зьніжэньня фондаў з мясцовых рэсурсаў, выдаючы іх поўнасьцю ў адведнасьці з колькасьцю чыгуначнікаў.

Пленум падкрэсьлівае, што справа палепшэньня рабочага спабжэньня зьяўляецца адной з важнейшых задач гаспадарчых, партыйных і прафсаюзных арганізацый на транспарце. Пленум даручае бюро ЦК забясьпечыць выкананьне дырэктывы ЦК УсеКП(б) ад 16/X 31 г. аб насыцы 10 адказных работнікаў на ўмацненьне транспартнай каапэрацыі.

9. Адзначаючы незадавальняючае становішча жыльлёвых і бытавых умоў рабочых-чыгуначнікаў на ўсіх раёнах (асабліва на Жлобіне і Воршы) і зусім неыстотнальную ўвагу з боку гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый да палепшэньня жыльлёвых і бытавых умоў, пленум ЦК і ЦКК абавязвае дырэкцыі чыгунак фарсаваць скончэньне намечанай на 1931 г. праграмы жыльлёвага і бытавога будаўніцтва на працягу лістапада, пры весьці ў належны парадак хапо (адчыненьне, апяленьне, палепшэньне санітарных умоў і г. д.).

10. Пленум ЦК і ЦКК прапануе гаспадарчым, партыйным і прафсаюзным арганізацыям на транспарце зьвярнуць асаблівую ўвагу на залічэньне, замацненьне, падрыхтоўку і правільнай расстаноўкі кіруючых кадраў, асабліва ў нізавых зьвеньнях. Неабходна весьці рашучую барацьбу з цякучасьцю кадраў, не дапушчаючы частых зрываў і непатрэбных перакідак работнікаў, разгарнуць шырокую падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў, рашуча вылучаючы лепшых ударнікаў з рабочага актыву на кіруюча-гаспадарчую і партыйна-прафсаюзную работу. Пашырыць сетку і кантынгенты курсаў школ і тэхнікумаў без адрыву ад вытворчасьці, забясьпечыўшы павышэньне якасьці вучэбнай работы.

Дырэкцыям чыгунак і раёнаў прыняць бездакладныя захады да поўнага ўкамплектаваньня школ ФЗВ і палепшэньня ўмоў (набудова інтэрнатаў, вучэбных плошчы), асабліва жлобінскай, магілёўскай, калінкавіцкай.

Дырэкцыям чыгунак і раёнаў зараз-жа скласьці плян падрыхтоўкі кадраў на 1932 г., а таксама прыступіць да складаньня плану будучыні пяцігодкі.

Пленум катэгарычна забараняе перакідку работнікаў транспарту без ведама ЦК на іншую работу. Даручыць бюро ЦК разгледзець пытаньне аб носіе перасоўваньня раду партыйных і прафсаюзных работнікаў на шэй Сольш адказным вучастках гаспадарчай работы ўнутры транспарту.

11. Пленум прапануе дырэкцыям чыгунак і раёнаў бездакладна падрыхтавацца на ўсіх лініях да барацьбы з сьнежнымі заносамі, закончыўшы ўсе падрыхтоўчыя работы і забясьпечыўшы лінію неабходнымі сродкам барацьбы (сьнегаачышчальнікі, лапаты, шчыты і інш.) не пазьней 20-га лістапада.

12. Адзначаючы, што з боку кліентуры маюць месца яшчэ да гэтага часу бездакладныя адносіны да скарыстаньня транспарту (несваячасовыя і неправільныя заяўкі, затрыманьне вагонаў пад нагрузкай і выгрузкай, сустрэчныя перавозкі), пленум ЦК і ЦКК прапануе бездакладна разгарнаваць і ўзмацніць апарат па плянаваньні перавозак і палепшыць яго работу, вылучыўшы ў якасьці старшыні МСМ т. Шапіра. Абавязаць усе гаспадарчыя і кааперацыйныя арганізацыі (Лесбел, Белгаапсаюз, ВСНГБ) цьвёрда выконваць дырэктыву ЦК аб скарыстаньні транспарту. ЦКК прыцягнуць да суровай партыйнай і судовай адказнасьці вінаватых у зрыве работы транспарту.

Адначасова пленум абавязвае Лесбел выкананць дагаворы на забясьпячэньні транспарту дровамі і драўнінамі матар'ялам, а ўсе гаспадарчыя арганізацыі дакладна і ў тэрмін выкананць свае абавязкі перад транспартам.

13. Прафсаюзныя арганізацыі на транспарце яшчэ не дабіліся сапраўднай мабілізацыі рабочых мас на выкананьне асноўных вытворчых задач, на ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны, на далейшае разгортваньне сацыяборніцтва і ўдарніцтва і падняцьця іх на вышэйшую ступень, на правілі належнай настойлівасьці ў ліквідацыі ўраўнілаўкі ў заработнай плаце і слаба спраўляюцца з задачай па падняцьці масавай і выхаваўчай работы на належную вышыню.

Выходзячы з гэтага, аб'яднаны пленум абавязвае ўсе прафарганізацыі на транспарце ліквідаваць адставаньне ў прафработе, рашуча змагаючыся з моментамі абязьлічкі і бездакладнасьці і апартуністычным «бавоўнішнем» з боку раду прафработнікаў і прафкамітэтаў. Узмацніць нізавыя праф. зьвеньні (брыгада, зьмена, група), наладзіць пастаяннае інструктаваньне, дыферэнцыраванае кіраўніцтва і жывую дапамогу нізавым прафоргам з боку райпрафсаюзаў і МК. ЦК ПСПБ забясьпечыць належную дапамогу з боку ўсіх мясцовых прафарганізацый прафсаюзам на транспарце.

14. У разе выпадкаў камуністы і асобныя партарганізацыі не ажыцьцяўляюць кіруючую авангардную ролю на вытворчасьці, не зьяўляюцца перадавікамі ў барацьбе за лепшыя паказальнікі, ня ўся маса камуністаў і камсамольцаў ушчэпнута ў сацыяборніцтва і ўдарныя брыгады. Рад партыйных арганізацый яшчэ не вядуць даволі рашучай і жорсткай барацьбы з апартунізмам, «сквотирательством» і бюракратызмам на транспарце.

Слаба разгорнута самакрытыка—гэта магутная зброя на выкрыцьці і зьнішчэньні недахопаў на транспарце.

Пленум ЦК і ЦКК прапануе партыйным арганізацыям галоўную ўвагу сканцэнтраваць на палепшэньні якасьці работы нізавых зьвеньняў (цэх, партгрупа, зьмена і г. д.), наладзіць апэрацыйнае, дыферэнцыраванае кіраўніцтва і штодзённую дапамогу нізавым партзьвеньням і дабіцца хутчэйшага аўладаньня тэхнікай камуністамі, якія працуюць на транспарце.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на ўмацаваньне работнікамі і палепшэньне кіраўніцтва нізавым транспартным друкам. Неабходна таксама значна палепшыць якасьць матар'ялу аб транспарце ў цэнтральных газэтах.

Абавязаць ЦК камсамолу палепшыць канкрэтнае кіраўніцтва і дапамогу транспартным камсамольскім арганізацыям.

15. Пленум лічыць зусім ненармальным наяўнасьць шматлікіх абследаваньняў на транспарце і частага адрыву вялікай колькасьці работнікаў ад апэрацыйнай работы. Пленум ЦК і ЦКК катэгарычна забараняе ўсякага роду абследаваньні транспартных арганізацый без дазволу ЦКК і прапануе ўсім тэрытарыяльным парткомам і транспартным партарганізацыям арганізаваць работу так, каб не дапушчаць частых адрываў работнікаў транспарту ад сваёй непасрэднай апэрацыйнай работы, у прыватнасьці для шматлікіх дакладаў у розных арганізацыях.

16. Адзначаючы, што ў раёне, асабліва ў нізавых гаспадарчых зьвеньнях недаволі цьвёрда праводзіцца адзіначальнасьць і назіраецца рад выпадкаў парушэньня адзіначальля як на віне партыйных і прафсаюзных арганізацый, якія ўмешваюцца ў апэрацыйную работу, так і на віне самых гаспадарнікаў, што ўхіляюцца ад адказнасьці і хаваюцца за сьпіну іншых арганізацый, — пленум прапануе гаспадарчым, партыйным і прафсаюзным арганізацыям зьнішчыць гэтае зьявішча, цьвёрда і пасьлядоўна ажыцьцяўляючы прынцып адзіначальля ва ўсіх зьвеньнях транспарту і стварыўшы належную абстаноўку і аўтарытэт для гаспадарнікаў.

17. Ня гледзячы на рад дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб узмацненьні кіраўніцтва і дапамогі транспарту і павышэньні адказнасьці за становішча транспарту з боку тэрытарыяльных парткомаў, да апошняга часу кіраўніцтва ў большасьці выпадкаў застаецца павярхоўным, неканкрэтным, а замест сапраўднай дапамогі маюць месца факты ўмешваньня ў апэрацыйнае кіраўніцтва транспарту. Аб'яднаны пленум катэгарычна патрабуе ад усіх мясцовых партарганізацый палепшэньня і дыферэнцыяцыі кіраўніцтва пасобнымі галінамі работы транспарту, папярэджваючы, што пры ацэнцы работы мясцовых партарганізацый ЦК і ЦКК будуць улічваць становішча і работу транспарту на месцах.

Вылучыць у вузлавых гаркомах і райкомах аднаго з членаў бюро для штодзённага кіраўніцтва работай на транспарце, максымальна разгрузіўшы яго ад іншых работ.

Пленум даручае бюро і сакратарыяту ЦК, а таксама гаркомам і райкомам КП(б)Б увесьці ў практыку пастаноўку дакладу аб рабоце нізавых гаспадарчых арганізацый транспарту (дэпо, станцыя, паравоз і г. д.).

18. Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае, што ўсе стачныя перад транспартам задачы, ліквідацыя адставаньня транспарту ад росту сацыялістычнай гаспадаркі, будуць выкананы пры ўмове няўхільнага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў тав. Сталіна, мабілізацыі шырокіх мас рабочых і партыйных арганізацый на барацьбу з апартунізмам, косьнасьцю, «сквотирательством», якія тармозяць поўнае правядзеньне дырэктыў партыі аб узмацненьні транспарту, пры ўмовах разгортваньня сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў ва ўсёй рабоце.

Работа партыйных і камсамольскіх арганізацый поўнасьцю яшчэ не перабудавана і ў радзе выпадкаў адстае ад тэмпаў, якія прад'яўляюцца транспарту.

ПАСТАНОВЫ АБ'ЯДНАНАГА ЛІСТАПАДАУСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК КП(б)Б

АБ РАЗВІЦЬЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ У БССР

ПА ДАКЛАДАХ т. т. РАЧЫЦКАГА і КАЛНІНА

1. «1931 і 1932 г. г. павінны быць гадамі такога-ж рашучага пералому ў разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, якімі былі 1929 і 1930 г. г. у справе арганізацыі сацыялістычнай збожжавай гаспадаркі». (З звароту ЦК УсеКП(б) і СНК СССР).

Праблема разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі і асабліва сьвінагадоўлі зьяўляецца актуальнай для БССР, як аднаго з важнейшых жывёлагадоўчых раёнаў Савецкага Саюзу. За апошні год у БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, дасягнуты значныя посьпехі ў справе разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Па БССР арганізавана 184 жывёлагадоўчых саўгасаў, у тым ліку 85 сьвінагадоўчых з агульным пагалоўем буйной рагатай жывёлы ў 49.129 шт.; з іх 26.000 кароў і 74.000 сьвіней, з якіх 28.300 сьвінаматак па саўгасах «Сьвінавод». Арганізавана 1018 малочна-таварных фэрм з агульным пагалоўем у 120.000, з якіх 72.000 кароў; 1600 сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм, з агульным пагалоўем у 120.000, з якіх 71.200 сьвінаматак.

Сацсэктарам у 1931 г. здана таварнай прадукцыі малака 670.660 цэнтнэраў і сьвіннога мяса 21.000 цэнтнэраў, што ў параўнальні з мінулым годам дае значнае павышэньне.

Разгорнута шырокае будаўніцтва абораў, сьвінарнікаў, птушнікаў, трусоўняў. Дасягнуты значныя посьпехі ў галіне стварэньня кармавой базы для жывёлагадоўлі.

2. Пленум ЦК і ЦКК падкрэсьлівае, што дасягнутыя посьпехі зьяўляюцца толькі пачаткам у справе вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы. Задачы фарсаванага разгортваньня жывёлагадоўлі яшчэ ня сталі ў цэнтры штодзённай увагі партыйных, савецкіх, зямельных і калгасных каапэрацыйных арганізацый. Існуе наўменьшае па-новаму канкрэтна і апэрацыйна кіраваць і працаваць на гэтым важнейшым і адказнейшым вучастку работы. Яшчэ не разгорнута сапраўдная бальшавіцкая барацьба за поўнае і своячасовае выкананьне плянаў па жывёлагадоўлі, адсутнічае сыстэматычная барацьба за паляпшэньне якасных показальнікаў і са стратамі ў жывёлагадоўлі, ня створана сталая кармавая база, мае месца нежаномнае выдткаваньне і разбазарваньне кармоў. Камплектаваньне саўгасных і калгасных фэрм, будаўніцтва абораў і сьвінарнікаў праходзіць нездавальняюча. Камплектаваньне птушкагадоўчых і трусагадоўчых саўгасных і калгасных фэрм зусім не разгорнута.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК пастанаўляе:

1. Лічачы абавязковым поўнае выкананьне намечаных плянаў 1931 г. па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, і необходным мабілізаваць увагу па ліквідацыю прарываў па выкананьні плянаў гэтага году, зацьвярдзіць аб'ём мерапрыемстваў па разьвіцьці жывёлагадоўлі, намечаных ЦК і СНК ад 22 жніўня г. г., даручыўшы Бюро ЦК іх удакладніць пры складаньні кантрольных лічбаў на 1932 г.

2. Выкананьне намечаных партыяй мерапрыемстваў па разьвіцьці жывёлагадоўлі патрабуе мабілізацыі шырокіх мас рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў, калгасьніц, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў, мабілізацыі ўсёй КП(б)Б на барацьбу за выкананьне плянаў разьвіцьця жывёлагадоўлі ў кожным саўгасе, калгасе, каапэрацыйнай фэрме і арганізацыі выразнага апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай справай. Неабходна дабіцца такога становішча, каб кожная партыйная ячэйка, кожны камуніст у паасобку, змагаліся за выкананьне плянаў жывёлагадоўлі так, як партарганізацыі перадавых прадпрыемстваў змагаюцца за выкананьне прамфінпляну.

3. Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б патрабуе ад усіх партарганізацый земорганаў, саўгастрэстаў і калгаснай сыстэмы паставіць у цэнтры сваёй практычнай работы задачу фармаваньня стада жывёлагадоўчых саўгасаў МТФ, СТФ, птушкагадоўчых і трусагадоўчых гаспадарак, як за лік выкананьня плянаў жывёлазагатовак, разгортваньня самазагатовак унутры калгасаў і сярод калгасьнікаў, так і асабліва за лік поўнага захаваньня і гадоўлі ўласнага прыплоду, што павінна зьявіцца асноўнай крыніцай камплектаваньня. Партарганізацыі, НКЗ, Саўгастрэсты і калгасныя сыстэмы павінны паставіць у цэнтры сваёй работы па разьвіцьці жывёлагадоўлі справу гадоўлі маладняка, праводзячы рашучую барацьбу з забоем маладняка, рагатай жывёлы і падзяжом парасят, з забоем сьвіней пад прыкрыцьцём эпізоатыі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выкананьне плянаў арганізацыі і камплектаваньня цялячых фэрм.

4 Адзначаючы надзвычай высокі процант ялавасьці кароў (10-15 проц.), і сьвіней (25-30 проц.), што тармозіць пашырэньня стада і прыносіць вялікія страты, пленум абавязвае:

а) Наркамзем, Саўгастрэсты, Калгасцэнтр разгарнуць шырокую работу па зьнішчэньні ялавасьці. У вызначаны тэрмін устанавіць цьвёрдую сетку злучных пунктаў па БССР, да 1/IV-32 г. закончыць арганізацыю іх. Правядзеньне злучной кампаніі павінна быць такой-жа важнейшай і ўдарнай кампаніяй як пасўная і ўборачая;

б) правесьці па працягу 1932 г. мэтызацыю ўсяго пагалоўя сьвіней у саўгасах, сьвіноводтрэстах і ня менш 50 проц. сьвіннога пагалоўя — у сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмах; па буйной рагатай жывёле—50 проц. ва ўсіх саўгасах і ня менш 30 проц.—у малочна-таварных фэрмах;

в) Улічваючы недастатковасьць высока-якасных вытворнікаў, арганізаваць не пазьней 1/IV-32 г. па ўсіх без выключэньня раёнах пункты штучнага апладненьня і зараз-жа разгарнуць масавую работу як па папулярызацыі гэтага мерапрыемства, так і па непасрэдным правядзеньні злучной кампаніі. Абавязаць Наркамзем забясьпечыць гэтыя пункты адпаведнымі кадрамі, прэпаратурай і абсталяваньнем.

5. Пленум абавязвае Наркамзем, дырэктароў Саўгастрэстаў і Калгасцэнтр забясьпечыць выкананьне пастановы ЦК і СНК аб народным раёнаваньні па жывёле, праводзячы рашучую барацьбу з недаацэнкай гэтай справы і месьніцкімі тэндэнцыямі ў канцэнтрацыі высока-якаснага племяннога матар'ялу. Даручыць СНК у месячны тэрмін памеціць сетку племянных баз і гадавальнікаў па БССР у адпаведнасьці з народным раёнаваньнем.

6. Прымаючы пад увагу тое, што конская цягавая сіла ў народнай гаспадарцы мае вялізарнае значэньне і што ў радзе месц існуе яўная недаацэнка каня, у сувязі з чым ёсьць выпадкі разбазарваньня коняй, прапанаваць НКЗ і РВК выканаць поўнасьцю пастанову ЦК і СНК аб разьвіцьці ў БССР конягадоўлі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якаснае яе паляпшэньне, шляхам шырокай мэтызацыі праз пункты штучнага апладненьня, і пашырыць колькасьць конязводаў і племянных пунктаў. Адначасова з гэтым весьці рашучую барацьбу з разбазарваньнем конскага пагалоўя.

7. Пленум абавязвае Наркамзем, Саўгастрэсты, дырэктароў саўгасаў і Белкалгасцэнтр правесьці ў 1932 г. наступныя канкрэтныя мерапрыемствы па барацьбе са стратамі ў жывёлагадоўлі: пагалоўную інвэнтызацыю сукроць чумы ўсяго сьвіннога стада ў сац. сэктары і дабіцца бязумоўнага выкананьня ва ўсіх гаспадарках шырокіх прафілактычных мерапрыемстваў, давесьці да мінімуму ялавасьць кароў і сьвіней, поўнае захаваньне маладняка, асабліва парасят, шырока ўжываючы прэміяваньне лепшых рабочых саўгасаў і калгасьнікаў за актыўную барацьбу са стратамі па жывёлагадоўлі. Даручыць НКЗ распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы барацьбы са стратамі ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах. ВЭТ забясьпечыць у намечаны тэрмін скончэньне пабудовы Віцебскай біафабрыкі, пашырыўшы вытворчасьць біапрэпаратаў і патаніўшы іх кошт.

8. У значнай частцы саўгасаў і ў пераважнай большасьці МТФ і СТФ яшчэ не замацаваны сталыя кадры работнікаў па скотных дварох і сьвінарніках, не ліквідавана абязьлічка ў рабоце па доглядзе жывёлы. Пленум патрабуе ад земорганаў, саўгастрэстаў, Калгасцэнтру, райкомаў і ячэек КП(б)Б укамплектаваць скотныя двары, сьвінарнікі саўгасаў, МТФ, СТФ, птушніцкія і трусагадоўчыя сталымі кадрамі працаўнікоў, вылучаючы іх з ліку лепшых, адданых справе рабочых і работніц саўгасаў, калгасьнікаў і калгасьніц. Рашуча ліквідаваць абязьлічку ў рабоце па доглядзе жывёлы. Забясьпечыць лепшыя ўмовы для работы сьвінароў, сьвінарак, даярак, скотнікаў і пастухоў, ад якіх у значнай ступені залежыць выкананьне плянаў выхаду і якасьці таварнай прадукцыі, перавесьці работу па доглядзе жывёлы па зьдзельна-прэміяльную сыстэму.

Даручыць НКЗ, саўгастрэстам, Калгасцэнтру ў месячны тэрмін распрацаваць канкрэтныя меры па ўкараненьні гаспадарчага разрахунку ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах.

9. Даручыць бюро ЦК памеціць спэцыяльныя мерапрыемствы па стымуляваньні разьвіцьця жывёлагадоўлі, асабліва сьвіней, праз устанаўленьне раду дадатковых ільгот для жывёлагадоўчых і асабліва сьвінагадоўчых калгасаў, у прыватнасьці прыраўняць гэтыя калгасы ў прадастаўленьні ільгот да ільнаводчых калгасаў.

Даручыць СНК распрацаваць у месячны тэрмін сыстэму прэміяваньня жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў, стварыўшы для гэтай мэты прэміяльны фонд у суме 500 тыс. руб.

10. Пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае неабходнасьць стварэньня моцнай кармовай базы для жывёлагадоўлі і прапануе НКЗ распрацаваць спэцыяльны план мерапрыемстваў, накіраваных на павышэньне ўраджайнасьці палявых культур, мерапрыемстваў па арганізацыі штучных выпасаў і паляпшэньні лугавых ужыткоўнасьцей, пашырэньні пасеву кармавых траў і карняплодаў. Партарганізацыі павінны паставіць у цэнтры ўвагі работу па павышэньні ўраджайнасьці, што зьяўляецца рашаючым у стварэньні моцнай кармавой базы.

Абавязаць Наркамснаб пабудаваць у 1932 г. буйны мэханізаваны завод па вырабе камбікармоў ня менш 50.000 тон, Наркамзем—пабудаваць у саўгасах і калгасах камбікормачныя заводы ў колькасьці 30 з вырабам да 180.000 тон. камбікармоў.

Устанавіць жорсткую эканомію ў выдаткаваньні кармоў па саўгасах і калгасах праз устанаўленьне кармавых рацыёнаў, мабілізацыю ўсіх унутраных рэсурсаў. Гэта мерапрыемства ні ў якім выпадку не павінна праводзіцца за лік здачы (продажу) прадукцыі дзяржаве.

11. У зьвязку са шпаркім разьвіцьцём жывёлагадоўлі праблема вырабу падсьцілачнага матар'ялу ў БССР набывае выключна важнае значэньне. Ад вырашэньня гэтай праблемы значнай ступені будзе залежаць узмацненьне кармавых рэсурсаў і ўзьнішэнне ўраджайнасьці. Пленум даручае ЭКАНА разгледзець і вырашыць у бліжэйшы тэрмін пытаньне аб вырабе торфападсьцілачнага матар'ялу і інш.

12. Ухваліць пастанову ЦК і СНК ад 22 жніўня г. г. аб арганізацыі ў калгасах, якія ня маюць сьвінагадоўчых, малочных і птушніцкіх таварных фэрм, калектыўнай гадоўлі і продажу дзяржаве ў плянавым парадку ад 10 да 50 сьвіней, ад 100-500 штук птушак, а таксама здачы малочнай прадукцыі—ад 30 да 50 проц. выхаду малака з абагуленага і не абагуленага стада. Зацьвердзіць план гадоўлі маладняка сельскімі і спажывецкімі таварыствамі ў разьмеры 42.000 шт., уключаючы выгадаваную прадукцыю ў плян загатовак.

13. Абавязаць ЭКАНА распрацаваць канкрэтны план мерапрыемстваў па мэханізацыі саўгасаў і калгасаў з тым, каб ужо ў 1932 г. мэханізаваць поўную выдачу добраякаснай вады і ня менш як на 50 проц падрыхтоўку і падачу кармоў, максымальна скарыстоўваючы для гэтае мэты сродкі і рэсурсы саміх саўгасаў і калгасаў. Устанавіць канкрэтнае заданьне прамысловасьці па вырабе машын і абсталяваньня.

14. Пленум прапануе Наркамзему, саўгастрэстам, Калгасцэнтру і Белсельбуду ўжыць энэргічныя меры для поўнага выкананьня, не пазьней 1/XII-32 г. плянаў будаўніцтва сьвінарнікаў, абораў, цялятнікаў, птушнікаў і трусоўняў. Правесьці ўцяпленьне ўсіх памяшканьняў на зімовы час. Лічыць неабходным устанавіць стандартны тып найбольш тацных сьвінарнікаў і абораў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць будаўніцтва і зьніжэньне кошту. Зараз-жа прыступіць да складаньня плянаў будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў на 1932 год, безадкладна прыступіўшы да практычнага разгортваньня гэтага будаўніцтва, ні ў якім разе не прыпыняючы яго ў зімовы час. Белсельбуду пашырыць сетку будвучасткаў з мэтаю больш шырокага ахопу будвучасткамі жывёлагадоўчых саўгасаў. Райкомам узяць пад свой непасрэдны нагляд будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах.

15. Бюро ЦК і СНК у бліжэйшы тэрмін вырашыць пытаньне аб арганізацыі адзінай дзяржаўнай сыстэмы, устанавіўшы парадак здачы непасрэдна па малочна-пераапрацоўчай прамысловасьці, арганізацыі шырокай сеткі сьліўна-аддаяльцельных пунктаў пераапрацоўкі малочнай прадукцыі, скасаваўшы ўсе прымежныя зьвяньні, якія ўдаражаюць кошт гэтай прадукцыі для спажыўца.

16. Пленум катэгарычна патрабуе ад усіх кіраўнікоў саўгастрэстаў, дырэктароў саўгасаў, Белкалгасцэнтру, раённых партыйных арганізацый і партячэек саўгасаў і калгасаў разгарнуць рашучую барацьбу за поўнае і своячасовае выкананьне плянаў па здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі, выкрываючы перад шырокімі масамі рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў шкоднасьць існуючых кулацка-капіталістычных тэндэнцый. Не пазьней, як праз месяц увесьці ва ўсіх без выключэньня гаспадарках сацсэктару строгі вучот выхаду і кантроль за здачай таварнай прадукцыі, асабліва па сьвінагадоўчых фэрмах.

17. Абавязаць Наркамзем, саўгастрэсты і Калгасцэнтр забясьпечыць падрыхтоўку кадраў вышэйшай, сярэдняй, ніжэйшай і масавай кваліфікацыі ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 22 жніўня 1931 г., адкрыўшы не пазьней 1 сьнежня г. г. усе намечаныя ў гэтай пастанове навучальныя установы. СНК БССР забясьпечыць фінансаваньне гэтых навучальных устаноў да канца 1931 г.

Наркампрацы і Наркамзему да 15/XII правесьці поўны вучот агра і зоавэт-спэцыялістаў, працуючых у апаратах савецкіх і гаспадарчых арганізацый, з мэтаю максымальнай перасоўкі іх з апаратаў непасрэдна на вытворчасьць — у жывёлагадоўчыя саўгасы, калгасы і МТС. Адначасова распрацаваць сыстэму мерапрыемстваў, павышаючых адказнасьць спэцыялістаў за іх працу, а таксама палепшыць матар'яльна-бытавыя ўмовы гэтых спэцыялістаў, у прыватнасьці разглядзець пытаньне аб павышэньні зарплаты спэцыялістам, працуючым непасрэдна на вытворчасьці.

РК КП(б)Б да 1/XII пераглядзець і палепшыць склад раённых упаўнаважаных Малако і Белмолкалгасцэнтру, зьмяніўшы непрацаздольных і не апраўдаўшых сябе па рабоце работнікаў, а таксама пераглядзець і палепшыць склад загатчыкаў фэрм у калгасах, павялічыўшы сярод іх партыйна-камсамольскае ядро.

Пленум даручае бюро ЦК распрацаваць дадатковыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і ўзмацненьні жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў партыйнымі кадрамі.

18. Пленум адзначае нездавальняючае становішча партыйна-масавай работы ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах, зусім недастатковую барацьбу партарганізацый за аўладаньне тэхнікай жывёлагадоўчай справы і разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Пленум прапануе райкомам КП(б)Б і сельпарткомам рашуча перабудаваць партработу ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах, на аснове практычнага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў т. Сталіна, перанясеньня цэнтру партработы непасрэдна ў пізавое вытворчае зьвяно (цэх, брыгада, фэрма, аддзяленьне) на аснове шырокага разгортваньня вытворча-масавай работы, арганізацыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, вылучэньня парторгаў і арганізацыі партгруп у цэхах і фэрмах.

Важнейшай і рашаючай задачай усіх камуністаў, працуючых у галіне жывёлагадоўлі, зьяўляецца сапраўднае аўладаньне тэхнікай жывёлагадоўчай справы. Гэта пленум ЦК і ЦКК лічыць абавязковым для кожнага камуніста жывёлагадоўчых саўгасаў, калгасаў і працуючых у зямельна-калгаснай сыстэме.

19. Даручыць рэдакцыям цэнтральных і мясцовых газэт сыстэматычна і шырока асьвятляць пытаньні разьвіцьця жывёлагадоўлі, выяўляючы лепшыя прыклады арганізацыі жывёлагадоўлі ў саўгасах і калгасах, робячы іх шырокім здабыткам рабочых і калгасьнікаў.

Адначасова з гэтым абавязаць Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі і Інстытут Сацыялістычнай Рэканструкцыі Сельскай Гаспадаркі імя Леніна забясьпечыць выпуск масавай навукова-папулярнай літаратуры па арганізацыі і тэхніцы ўсіх відаў жывёлагадоўлі.

20. Абавязаць ЦСНСБ распрацаваць рад спэцыяльных мерапрыемстваў прафмасавай работы ў жывёлагадоўчых саўгасах, у прыватнасьці, намеціць плян шырокай арганізацыі шэфства рабочых заводаў.

На здымку: Лепшыя ўдарнікі заводу імя Варашылава т. т. Міньковіч, Высоцкі, Глейхельгаўз, Кроль, Валахановіч і Наўбан.

Аб рабоце Днепра-Дзьвінскага рэчнага транспарту

ПА ДАКЛАДУ тав. ЯРШОВА

Заслухаўшы даклад тав. Яршова аб рабоце Днепра-Дзьвінскага рэчнага транспарту, аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК адзначае:

Побач з некаторым павялічэньнем работы воднага транспарту (павялічэньне грузазвароту з 266.000 тон у 1930 г. да 414.303 тоны да 10/XI 31 г.) рэчны транспарт ня выканаў важнейшых дырэктыў ЦК УсеКП(б) ад 5-га лютага і ЦК КП(б)Б ад 17-га сакавіка 1931 г. Рэчны транспарт не скарыстаў усіх магчымасьцяй у бягучую навігацыю і да гэтых часоў застаецца самым адсталым вучасткам народнай гаспадаркі БССР.

Асноўнымі недахопамі рэчнага транспарту зьяўляюцца: а) коснасьць і непаваротлівасьць у перабудове ўсёй работы транспарту, вялікае спазьненьне з правядзеньнем важнейшых мерапрыемстваў у выніку чаго простая дырэктыва ЦК КП(б)Б адносна перавозкі 45 проц. усіх грузаў у веснавую навігацыю ня выканана.

Ураўнілаўка ў зарплаце і абязьлічка на вытворчасьці ўсё яшчэ застаюцца галоўнымі тормазамі, якія затрымліваюць павышэньне работы воднага транспарту.

Дрэннае плянаваньне, безадказнасьць і галавацяпства з боку клієнтуры (Лесбел, Дартранс, Плодагародніна) прывялі да таго, што рэчны транспарт працаваў з вялікім недагрузам і скарыстоўваўся нерацыянальна.

Пленум ЦК і ЦКК прапануе гаспадарчым, партыйным і прафэсыянальным арганізацыям у максымальнай меры скарыстаць час да канца навігацыі для выкананьня пляну грузаперавозак.

У мэтах належнай падрыхтоўкі да навігацыі 1932 г. пленум ЦК і ЦКК прапануе:

1. Усім партыйным, гаспадарчым і прафэсыянальным арганізацыям правесьці неабходныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць поўнае правядзеньне суднарамонту, для чаго: да 1-га сьнежня поўнасьцю перабудаваць сыстэму зарплаты ў майстэрнях і суднабудаўнічых вэрфях па групце прагрэсыўна-прэміяльнай зьдзельшчыны, поўнасьцю перавесьці на сапраўды гаспадарчы разрахунак майстэрні і суднавэрфі.

2. Не пазьней 1-га сьнежня замацаваць за суднамі ўвесь камандны склад (камандзіры, механікі, рулевыя, атаманы), рашуча дабіваючыся ўзмацненьня кіруючага складу на ўсіх суднах.

3. Кіраўніцтву ДДРТ, партыйным і прафэсыянальным арганізацыям максымальна скарыстаць зімовы час для падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, для чаго арганізаваць сетку курсаў для вядучых прафэсій.

У месячны тэрмін выкананьне пастановы ЦК аб адкрыцьці ФЗВ.

Даручыць т. Яршову паставіць пытаньне перад Наркамводам аб адкрыцьці ў БССР воднага тэхнікуму на працягу 1932 г.

4. Пленум абавязвае кіраўніцтва ДДРТ, МСП і ўсе гаспадарчыя арганізацыі не пазьней чым да 15-га студзеня распрацаваць плян перавозак на 1932 г. з тым, каб на падставе гэтага пляну кіраўніцтва рэчнага транспарту распрацавала апэрацыйныя планы на кожны гаспадарчай адзінцы і спусьціла іх не пазьней як за месяц да пачатку навігацыі.

5. Улічваючы выключную запушчанасьць водных шляхоў БССР і зусім незадавальняючае тэхнічнае становішча флёту, пленум ЦК і ЦКК абавязвае кіраўніцтва ДДРТ, фарсаваць разгортваньне работы па рэпаратурыцкіх водных шляхоў БССР з такім разьлікам, каб правесьці ў 1932 г. рад буйных капітальных работ на паляпшэньне ўмоў суднаходства і мэханізацыі пагрузкі і выгрузкі, а работы па пабудове Гомельскага порту і шлюзаваньня ракі Сож весьці такімі тэмпамі, каб скончыць іх к пачатку навігацыі 1933 г.

6. Адзначаючы ненармальнае становішча ў сувязі з тым, што Днепра-Дзьвінскі рэчны транспарт пазбаўлены магчымасьці праводзіць транзітныя перавозкі грузаў з межаў БССР, пленум даручае бюро ЦК і СНК паставіць перад Наркамводам пытаньне аб перадачы транзітных перавозак Днепра Дзьвінскаму рэчнаму транспарту.

7. Партыйна-масавая і прафэсыянальная работа рэчнага транспарту ўсё яшчэ поўнасьцю не перабудавана і знаходзіцца ў яўна нездавальняючым становішчы. Партпрослойка зусім нязначная. Камуністы і камсамольцы ў радзе выпадкаў ня ідуць на чалы работы і ў барацьбе за выкананьне трансфінпляну, прыкмеціць слабы ўдзел у сапсаборніцтве і ўдарніцтве і слабы мабілізаваны на перамаганьне бюракратычнай косных і апартуністычнага самацёку ў апараце.

Пленум ЦК і ЦКК даручае партыйным і прафэсыянальным арганізацыям, а таксама РК і ГК у бліжэйшы час поўнасьцю перабудаваць партыйную і прафэсыянальную работу рэчнага транспарту, адаўшы асаблівую ўвагу партыйнай і камсамольскай прослойцы. Паставіць, як адну з важнейшых задач на зімовы перыяд марксыцка-ленінскае выхаваньне і вывучэньне тэхнікі ўсім складам транспарту.

Пленум патрабуе ад усіх мясцовых партыйных і прафэсыянальных арганізацый канкрэтнага кіраўніцтва і рэальнай дапамогі рэчнаму транспарту.

Забараніць практыку перасідкі работнікаў з рэчнага транспарту.

8. Пленум даручае бюро ЦК у месячны тэрмін мабілізаваць 30 работнікаў, у першую чаргу былых воднікаў, для ўзмацненьня важнейшых участкаў гаспадарчай, партыйнай і прафэсыянальнай работы на рэчным транспарце.

ВЫРАЗНАЕ АПЭРАЦЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА —разьмеркаваньню даходаў у калгасах

35 проц. калгасаў яшчэ ня склалі праектаў па разьмеркаваньні даходаў

Ужо прайшло больш месяца пасьля кантрольнага тэрміну для скончэньня складаньня праектаў разьмеркаваньня даходаў у калгасах. Між тым на 15 лістапада па 55 раёнах БССР толькі 64,6 проц. калгасаў склалі такія праекты і 60,3 проц. выдалі авансы калгасьнікам.

У радзе раёнаў разьмеркаваньню даходаў у калгасах—гэтаму важнейшаму пытаньню арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў—аддаецца злачынна мала ўвагі. У Рэчыцкім раёне праекты разьмеркаваньня склалі ўсяго 18 проц. калгасаў, у Чэрвеньскім—21 проц., у Жлобінскім—26 проц., у Сеньненскім—27 проц., у Менскім—37 проц.

Раёны, якія па гэту справу мабілізавалі выстарчальную колькасьць адказных і рахункаводных работнікаў, прымацаваўшы іх да пэўнай групы калгасаў, ужо скончылі складаньне праектаў. Да гэтых раёнаў адносяцца: Асьвейскі, Вузьдзенскі, Чэрвеньскі, Чырвона-Слабодзкі, Полацкі, Лепельскі.

У большасьці раёнаў ня выканана пастанова НКЗБ і Калгасцэнтру БССР аб прымацаваньні адказных раённых работнікаў да групы ў 5-10 калгасаў. Штат грамадзкіх інструктароў з лепшых калгасьнікаў-ударнікаў, каб па кожным 5 калгасаў прыходзілася ня менш як па адным інструктару, ня створан.

Калгасцэнтр БССР вынес аб гэтым пастанову яшчэ 3 верасьня, але не выкананьня не дабіваўся. Кіраўнік сэктару арганізацыі працы Калгасцэнтру тав. Балцін лічыць, што прымацаваць адказных работнікаў да такіх невялікіх груп калгасаў зусім немагчыма, бо работнікаў у раёне няма. У раёнах-жа не сьпяшаюцца з правядзеньнем гэтага мерапрыемства Калгасцэнтру, якое сам Калгасцэнтр лічыць неажыцьцёўным.

Арганізацыйны сэктар Калгасцэнтру, здавалася-б, абавязан дабівацца выкананьня пастановы аб стварэньні кадру па-заштатных інструктароў. Адназ, ён гэтым не займаецца.—І на сёньняшні дзень невядома, колькі такіх інструктароў па БССР вылучана. Толькі 7 райкалгассаюзаў наведамілі аб вылучэньні інструктароў.

Калгасцэнтр да гэтага часу ня выканаў пастановы ЦК КП(б)Б аб правядзеньні прыкладнага разьмеркаваньня даходаў у розных тыпах спэцыялізаваных калгасаў. Зьмешчаны ў друку матар'ял толькі аб разьмеркаваньні даходаў у адным сьвінагадоўчым калгасе. Паводле слоў тав. Балціна здана ў друк брашура аб практыцы разьмеркаваньня даходаў у ільнаводчым калгасе і рыхтуецца да друку матар'ял аб садова-гароднім калгасе. На запытаньне, калі гэтыя кнігі будуць выпушчаны, быў дан такі адказ:

«Добра, калі і да пастуднага году».

Прыведзеныя факты сьведчаць, што Калгасцэнтр недапушчальна слаба кіруе кампаніяй разьмеркаваньня даходаў у калгасах. Адпаведныя работнікі Калгасцэнтру, на абавязку якіх ляжыць ажыцьцяўленьне важнейшых мерапрыемстваў і праверка выкананьня дырэктыў па справе, гэтым не займаюцца.

З такой шкоднай практыкай трэба рашуча пакончыць. Разьмеркаваньню даходаў павінна быць забясьпечана сыстэматычнае і апэрацыйнае кіраўніцтва. Усе дырэктывы і мерапрыемствы, вызначаныя партыйнымі і ўрадавымі органамі, павінны быць неадкладна ажыцьцёўлены.

Х.

Дабаўленьне працадзён на „беднасьць“

ДРЫСА. Праверка паказвае, што ў радзе калгасаў раёну сапраўдная зьдзельшчына яшчэ не ўкаранена. Замест зьдзельшчыны ў такіх калгасах існуе замаскаваная падзёншчына, у выніку якой мы маем разьмеркаваньне даходаў фактычна па прынцыпах ураўнілаўкі. Яркім прыкладам служыць калгас «Аб'яднаньне». Аб якасьці яго зьдзельшчыны сьведчыць той факт, што калгасьнікам, якія ня выконвалі нормы, усёроўна запісвалі «палачку».

Перашоўшы па зьдзельшчыну толькі фармальна, праўленьне гэтага калгасу да самага апошняга часу ўсё яшчэ выдае авансы па едаках. Калгасьнікі атрымлівалі малако, мяса, гародніну і інш. прадукты, не ў залежнасьці ад таго, колькі і як працаваў той ці іншы калгасьнік. Парэшце, пры папярэднім разьмеркаваньні даходаў была зроблена спроба ўраўняць усіх шляхам устанаўленьня адлічэньня «падзяцей і непрацаздольных 20 проц. валавога даходу».

Калі ў адным з калгасаў раёну пры праверцы аказалася, што па некаторых калгасьнікаў мала прыходзіцца працадзён, дык была высунута прапанова дадаць ім працадзён па «беднасьць». У радзе выпадкаў гэтыя дадаткі складалі 100 проц. у адносінах сапраўды выпрацаваных працадзён. Удзячныя «беднякі», якія атрымалі дадатковыя працадні, у сваю чаргу вынесьлі прапанову дадаць працадні сваім «благодетелям» за стараную работу. На такое дабаўленьне працадзён ідуць нават некаторыя партыйцы й агрономы, гэтым паказваючы сваё поўнае неразуменьне сутнасьці зьдзельшчыны і разьмеркаваньня даходаў па працоўным прынцыпе.

Фактычная падзёншчына і ўраўнілаўка ў разьмеркаваньні даходаў вядзе да абесцаненьня прынцыпа, аб зьніжэньня таварных магчымасьцей і праяўленьня аспэктаў фондаў калгасаў. Яркім доводам гэтага служыць калгас «Аб'яднаньне», які гаспадарыць разбазарваў малочную таварную прадукцыю. Выдача сям'і кожнага калгасьніка малака дайшла тут да 10 літраў у дзень.

Гаённыя арганізацыі і асабліва райкалгассаюз павінны ўлічыць сумны вопыт такіх калгасаў. Трэба прыняць самыя рашучыя меры для ўкараненьня ва ўсіх калгасах сапраўднай зьдзельшчыны, мабілізуючы шырокія масы калгасьнікаў на жорсткую барацьбу з імкненьнямі клясавага ворага і яго агентуры сарваць арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

З.

Слуцкі райкалгассаюз займаецца „очковтирательством“

СЛУЦАК. (Наш кар.). Пытаньням арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў Слуцкі райкалгассаюз усё яшчэ не аддае належнай увагі.

Даволі прыкмецьці, што з 175 калгасаў на зьдзельшчыну пераведзены толькі 150. Між тым райкалгассаюз запэўнае, што «ўсе калгасы на зьдзельшчыне, усюды ёсьць дакладны ўлік працы». Гэта не адпавядае сапраўднасьці. Райкалгассаюз, пасылаючы такія весткі ў вышэйшыя органы, фактычна займаецца «очковтирательством».

У калгасах Лучнікоўскага сельсавету зьдзельшчына зусім адсутнічае. У калгасах «Шлях саветаў» і імя Молатава пра зьдзельшчыну нават і ня чулі.

Кіраўніцтва калгасу «Прамень кумуны» ня ведае, колькі хто і як працаваў з калгасьнікаў. У выніку—брыгадзе касцоў ня было залічана 260 працадзён.

Слуцкі райкалгассаюз замест таго, каб заграе-жа павярнуцца тварам да арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, шырока практыкуючы перасяленьне вопыту лепшых калгасаў у адсталыя.

Вінаватых у «очковтирательстве» трэба прыцягнуць да адказнасьці.

П. М.

З БАЛЬШАВІЦКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЮ ЗМАГАЦЦА СУПРОЦЬ ПРАЯЎЛЕНЬНЯЎ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНАГА РАСІЙСКАГА ШАВІНІЗМУ

„РАШУЧА ЎЗМАЦНІЦЬ ПАРТКІРАЎНІЦТВА НА ЎСІХ ВУЧАСТКАХ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА... УЗЬНЯЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА БЕЛАРУСІЗАЦЫЮ НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ“
(З ЛІСТА ЦК КП(б)Б)

Узьнімаць беларусізацыю на вышэйшую ступень

Ленінскай нацыянальнай палітыкі—неадлучная частка агульнага змаганьня бальшавіцкай партыі за поўную перамогу сацыялізму. КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, ядучы непрымірымае змаганьне супроць галоўнай небясьпекі—ухілу ад вялікадзяржаўнага шавінізму, разгромы беларускі контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратызм, дабіўшіся вялікіх посьпехаў на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Мясцовыя партарганізацыі ў асноўнай сваёй масе ўзмацнілі партыйнае кіраўніцтва нацыянальна-культурным будаўніцтвам, змаганьне за ашчэ шырэйшае разгортваньне беларусізацыі. Аднак, асобныя парт'ячэйкі і нават раённыя арганізацыі ашчэ не ў выстарчальнай меры вядуць работу па практычным ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Месячнік генеральнай праверкі беларусізацыі, які праводзіўся некалькі месяцаў таму назад, у некаторых арганізацыях не зрабіў пералому. Асобныя партыйныя ячэйкі Віцебскай арганізацыі не мабілізавалі мас на ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і яе сустаўной часткі беларусізацыі, на змаганьне з ухіламі да вялікадзяржаўнага шавінізму. За апошні час па Віцебску мелі месца новыя факты выказак вялікадзяржаўных шавіністаў супроць беларусізацыі.

Гэта абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі і, у першую чаргу, Віцебскую ў часе перавыбараў кіруючых парторганаў глыбока праверыць стан беларусізацыі і работу сярод сацыялістычных меншасьцяй. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваім лісьце падкрэсьлівае, што «справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна замацаваць нашы посьпехі і мабілізаваць масы на далейшае разгортваньне нацыянальна-культурнага будаўніцтва і правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі».

Прафсаюзныя арганізацыі работу па беларусізацыі ашчэ не паставілі ў цэнтр увагі сваёй штодзённай дзейнасьці. Рэйд брыгад «Зьвязды», які гэтымі днямі быў праведзен, выявіў што прафсаюзныя арганізацыі слаба змагаюцца за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі па нацыянальнай палітыцы. Рад клюбаў ня сталі тымі цэнтрамі ў барацьбе за беларусізацыю, якімі яны павінны быць. Рад навучальных устаноў ня толькі не аказваюць дапамогі рабочым калектывам у аўладаньні беларускай пралетарскай культурай, а нават у сваю штодзенную работу не ўкараніялі беларусізацыі.

Гэта ўсё з усёй рэзкасьцю ставіць пытаньне перад партыйнымі арганізацыямі аб узмацненьні змаганьня за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і яе неадлучнай часткі ва ўмовах БССР беларусізацыі.

Вялікадзяржаўныя шавіністы імкнуцца сарваць беларусізацыю. Адмаўляючы беларускую мову, пагардліва адносячыся да яе, супраціўляючыся беларусізацыі, вялікадзяржаўныя шавіністы імкнуцца падарваць правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі. Мацней агонь па ўхілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, больш настойліва ўзьнімаць на вышэйшую ступень беларусізацыю, не паслабляць барацьбы з праявамі нацдэмакратызму, з шавінізмамі усіх колераў, — вось лёзунгі, якія павінны быць цэнтральнымі ў справаздачна - перавыбарчай кампаніі парторганаў.

Дырэктывы праверачнай камісіі паложаны пад сукно

У ліпені спэцыяльная камісія правяла становішча беларусізацыі ў Лесбеле. У сваіх выводах камісія канстатавала, што апарат беларусізаваны невыстарчальна, выявіла рад праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму. Адначасова з гэтым камісія падкрэсьліла, што рад кіруючых работнікаў (Бочка, Гарбуз, Куцэвіч, Рывіч, Стульба і інш.) не разумеюць асноўных прынцыпаў ленінскай нацыянальнай палітыкі. Пры правядзеньні праверачнай работы выяўлена актыўнае супраціўленьне беларусізацыі з боку вялікадзяржаўнага шавініста Кісяля.

Праверачная камісія вынесла рад канкрэтных прапаноў, якія 28 ліпеня былі абмеркаваны на агульным сходзе супраціўнікаў Лесбелу.

Здавалася-б, што партыйная ячэйка і прафсаюзная арганізацыя ўжыўуць усе меры для таго, каб поўнасьцю ажыцьцявіць прапановы камісіі. Аднак, гэтага на справе ня было. Становішча беларусізацыі ўсё ашчэ застаецца нездавальняючым. Праверка ня ўмесла карэннага пералому. Пастановы праверачнай камісіі паложаны пад сукно.

Бюро партыйнай ячэйкі і мясцком «займаліся» пытаньнямі нацыянальнай палітыкі, выносілі рад пастаноў, але не дабіваліся таго, каб гэтыя пастановы і дырэктывы ператварыць у канкрэтную справу.

Мясцком на раз выносіў пастанову аб арганізацыі гуртка па беларусазнаўстве. Аднак, і да гэтага часу гурток не заснаваны. Рад супраціўнікаў ня толькі ня ведаюць эканомікі, гісторыі і пралетарскай культуры БССР, але нават дрэнна ўладаюць беларускай мовай. Сродкі, адпушчаныя на літаратуру, не скарыстаны, між тым у бібліятэцы зусім малая колькасьць беларускіх кніг.

Праверачная камісія пасталавіла зьняць з работы вялікадзяржаўнага шавініста Кісяля. Партыйная ячэйка і кіраўніцтва ўстановы яўна ігнаруюць гэту пастанову праверачнай камісіі. Вялікадзяржаўны шавініст Кісель працуе ва ўстанове і да сёнешняга дня.

Партыйная ячэйка павінна ўжыць усе меры для таго, каб выканаць дырэктывы праверачнай камісіі, мабілізаваць масы на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, узьняць беларусізацыю на вышэйшую ступень.

Брыгада «Зьвязды» **Матыцкі, Голубаў.**

Мацней агонь па супраціўленцах беларусізацыі

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваёй пастанове аб Віцебскай арганізацыі канстатаваў недапушчальнае адставаньне гарнтарганізацыі ў ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Абноўленае кіраўніцтва Віцебскай арганізацыі, у мэтах рэалізацыі пастановы ЦК КП(б)Б, ужыло рад мер, накіраваных на забесьпячэньне посьпяховага правядзеньня нацыянальнай палітыкі і яе сустаўной часткі — беларусізацыі. Пленум гаркому і гарКК, абмеркаваўшы пытаньне аб практычным правядзеньні нацыянальнай палітыкі, намеціў канкрэтную праграму дзеяньняў па гэтым адказнейшым вучастку партыйнай работы.

Нізавыя партарганізацыі і парткалектывы ў невыстарчальнай меры пераключыліся на ажыцьцяўленьне пастаноў пленуму гаркому. Некаторыя ячэйкі, асабліва савецкіх устаноў, пытаюцца ў беларусізацыі, работы сярод нацменшасьцяй не паставілі ў цэнтр увагі сваёй штодзённай працы.

У **вэтэрынарным інстытуце** група студэнтаў катэгарычна адмовілася пісаць канспэкты на беларускай мове. Студэнтка **Бурзнева** называе беларускую мову «хамскай», «мужычай» і г. д. У **палітэхнікуме** настаўнік **Грыцун** патрабуе ад студэнтаў, каб яны гаварылі і пісалі выключна на расійскай мове. Беларускі тэкст ён патрабуе перакласьці на расійскую мову, тлумачачы тым, што напісанае па-беларуску не перадае таго сэнсу, які патрэбен.

Праяўленьні вялікадзяржаўнага шавінізму зыходзяць ня толькі ад бюракратычна-чыноўніцкіх элемэнтаў, але і паасобных членаў партыі. Партыйка **Максімава**—работнік страхкасы, адкрыта выступае супроць беларусізацыі і стараецца даказаць, што «беларуская мова выдумана, што яна ня існуе» і г. д. Супраціўнік ПРК, член партыі **Звонкін** адкрыта заяўляе: «Вучыць беларускую мову ні ў якім разе ня буду, пайду на што хочаце, абы толькі пазбавіцца ад гэтай справы». Яго падтрымлівае **Горфункель.**

Разам з адкрытымі вылазкамі вялікадзяржаўных шавіністаў супроць беларусізацыі мы маем і такія факты, калі некаторыя працаўнікі, ведаючы беларускую мову, дэманстрацыйна ня хочуць гаварыць па-беларуску. У прыватнасьці, былы член партыі і сакратар адной з чыгуначных парт'ячэек **Шалаеў** у сваім выступленьні заяўляе: «Я не хочу ломать язык и вообще имею желание скорее выбраться из Белоруссии, ибо мне нужно посылать своих детей в школу. В белорусскую школу посылать не могу, потому что этот язык портит детей». Загадчык магазыну мэталістаў № 1 **Зелянкін** добра ведае беларускую мову, але па ёй не гаворыць. Нават тады, калі наведвальнікі зварачаюцца да яго па-беларуску, ён адказвае па-расійску з патрабаваньнем: «Говорите со мной исключительно по-русски ибо я по белорусски не понимаю».

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што **вялікадзяржаўныя шавіністы актызізавалі сваю дзейнасьць** і ўжываюць усе меры для таго, каб падарваць справу правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі і яе сустаўной часткі—беларусізацыі.

Ня гледзячы на тое, што гарадзкая кантрольная камісія ня раз канстатавала недапушчальнае адставаньне ў беларусізацыі каапэрацыйных арганізацыяй, апошнія літаральна ні на адзін крок не пасунуліся наперад. Амаль усе супраціўнікі ПРК і ЗРК ня ведаюць беларускай мовы і абслугоўваюць наведвальнікаў выключна па расійскай.

Адстае і рад прадпрыемстваў. На **шкацінкай і акулярнай фабрыках** масавая работа партыйных і прафсаюзных арганізацый праводзіцца на расійскай мове. Калі адпойны на рабочым сходзе акулярнай фабрыкі рабкор тав. **Цвей** выступіў на беларускай мове, дык яго асьмялялі. Партыйная ячэйка не дала адпору вялікадзяржаўным шавіністам. І гэта невыпадкова. Сакратар парткалектыву фабрыкі не разумее таго, што беларусізацыя зьяўляецца сустаўной, неадлучнай часткай ленінскай нацыянальнай палітыкі ва ўмовах БССР. Ён дае такую «ўстановачку»: беларускай мовы ніхто і ня ведаць, а вось аб нацпалітыцы трэба ведаць кожнаму камуністу.

Віцебская партарганізацыя ўступіла ў паласу перавыбараў партыйных органаў. Адной з цэнтральных задач справаздачна-перавыбарчай кампаніі зьяўляецца праверка, наколькі партыйныя калектывы і ячэйкі ў практычнай рабоце забясьпечылі ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, наколькі мабілізавалі масы на змаганьне з ухілам да вялікадзяржаўнага шавінізму.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Беларусізацыю—у парадак дня ячэйкі

ВНУ, ВТНУ і тэхнікумы павінны адыграць вялікую ролю ў дапамозе вытворчым калектывам па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Будаўнічы інстытут ня толькі не ажыцьцяўляе гэтай задачы, а нават не дабіўся таго, каб у сваёй штодзённай рабоце ўкараніць беларусізацыю, аўладаць беларускай пралетарскай культурай.

Многія студэнты ня ўжываюць беларускай мовы. Паасобныя з іх супраціўляюцца беларусізацыі, праяўляюць вялікадзяржаўна-шавіністычныя настроі.

Былі выпадкі, калі вялікадзяржаўна настроеныя студэнты перапынялі выкладчыка, які гаварыў па-беларуску і патрабавалі, каб ён вёў выкладаньне на расійскай мове.

Партыйная ячэйка не разгарнула жорсткай барацьбы з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага шавінізму.

Партыйная ячэйка нават не беларусізавала ашчэ сваёй работы. У прыватнасьці, сакратар парткалектыву тав. **Абрамаў** справаздачу аб дзейнасьці бюро рабіў на расійскай мове.

Гаўрылічык.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку“

КАЛГАСЫ ПАВІННЫ ПАКАЗАЦЬ ПРЫКЛАД

УЗОРНАГА ВЫКАНАНЬНЯ СВАІХ АБАВЯЗКАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ

„...Барацьба супроць спажывецкіх настрояў у калгасах...—барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгаснага будаўніцтва“ (з пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б)

58,7 проц. гадавога пляну

Калгассыстэма БССР ашчэ не дабілася рашаючага зруху ў адносінах ажыцьцяўленьня дырэктывы ЦК КП(б)Б па збожжазагатоўках. На 15-га лістапада калгасы здалі дзяржаве толькі 58,7 проц. гадавога пляну.

Там, дзе калгассыстэма ўлічыла важнасьць свячасовай здачы збожжа, дзе партыйныя арганізацыі мабілізавалі калгасную масу навакол загатовак, разгарнулі шырокае сацыяборніцтва паміж калгасамі на хутчэйшае выкананьне плянаў — дасягнуты ўзорныя бальшавіцкія тэмпы ў загатоўках збожжа. Так, калгасы **Прапойскага** раёну выканалі плянавае заданьне на 129,1 проц., **Сіроцінскага** — 121,5 проц., **Глускага** — 102, **Шклоўскага** — 152,3 і г. д.

Посьпехі калгасаў, якія перавыканалі кантрольныя лічбы, паказваюць, што пляны здачы збожжа зусім рэальныя, што галоўнай прычынай нездавальняючага ходу загатовак па радзе раёнаў зьяўляюцца апартуністычныя скажэньні дырэктыў партыі і ўраду.

Чавускі райкалгасаюз, напрыклад, пры давядзеньні плану загатовак да калгасаў даў паказаньні апошнім, што яны могуць самі разглядаць гэтыя пляны і ў выпадку «непасільнасьці» зьмяншаць іх. Калгасы Касьцюковіцкага, Аршанскага, Лепельскага раёнаў атрымлівалі на тры розныя пляны здачы збожжа і ня ведалі, які з іх выконваць.

У **Брагінскім** раёне калгас «Прабуджэньне» здаў дзяржаве ячмень, проса, грэчку, авёс і інш. культуры, а ўвесь ураджай жыта і пшаніцы пакінуў сабе і разьмеркаваў сярод калгасьнікаў.

Калгасы Лельчыцкага раёну выканалі пляц загатовак толькі на 18 проц., Лагойскага — на 28, Чашніцкага — на 21,8, Веткаўскага — на 24.

Нездавальняючыя вынікі здачы збожжа ў гэтых раёнах сьведчаць аб недаацэнцы арганізацыі збожжазагатовак у калгасах, аб пасіўнасьці апартуністычных, самацёчных настрояў, якія вядуць да аслабленьня барацьбы з кулацкімі ўплывамі, з дробна - буржуазнымі тэндэнцыямі сярод адсталых груп калгасьнікаў. Спробы схаваць сапраўдны разьмер ураджаю, перапавялічыць патрэбы і тым ашукаць дзяржаву не сустракалі належнага адпору ў гэтых мясцох.

Калгассыстэма БССР павінна паказаць прыклад узорнага выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Здача збожжа зьяўляецца **першачарговай задачай** калгасаў. Спробам кулацтва сарваць загатоўкі трэба супрацьпаставіць мабілізацыю мас калгасьнікаў на барацьбу з клясавым ворагам, за поўнае выкананьне плянаў збожжазагатовак.

Раўняючыся па перадавых калгасах, дабіцца перамогі на збожжазагатоўчым фронце!

Узорны прыклад калгасу „Камінтэрн“

КОЙДАНАВА. Нацыянальны польскі калгас «Камінтэрн», Рубілкаўскага сельсавету, у выніку рашучай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай унутры калгасу, шырокага растлумачэньня калгасьнікам іх абавязкаў перад дзяржавай дасягнуў рашаючых посьпехаў у галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня гаспадаркі і поўнасьцю выканаў пляны загатовак.

Збожжавых культур здана на 2 цэнтн. больш заданьня, масьлічных — на 10 цэнтн., бульбы — на 120, сена — на 3. Такім чынам пляны загатовак усіх відаў перавыкананы. Перавыкананы таксама плян заблівага ворыва (на 250 га звыш пляну). У сваім рапарце раённым арганізацыям калгас «Камінтэрн» запэўніў, што ён будзе з ашчэ большай настойлівасьцю змагацца за вырашэньне ўсіх чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

На паваду ў кулацкіх элемэнтаў

НАРОЎЛЯ. Па гледзячы на выразныя дырэктывы аб здачы збожжа ў першую чаргу дзяржаве, праўленьне калгасу **«Чырвоны Цяшкоў»** затрымлівае лішні збожжа ў сваіх сьвірнах. Калгас атрымаў плян здачы збожжа ў разьмеры 52 цэнтн. Ён здаў толькі 8 і то прадукцыі летапняга ўраджаю. Збожжа тэтага году ён ашчэ не абмалаціў і яўна ігнаруе выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Выяўленьні факты, якія гавораць аб тым, што старшыня праўленьня калгасу **Кухнавец** сьвядома ашуквае партыю і дзяржаву. Збожжа-фуражны баланс паказвае валавы збор жыта ў 374 цэнтнэры, калі праверылі больш дэтальна, дык аказалася, што жыта павінна быць 522 цэнтнэры. Такі-жа малюнак з аўсом: на балянсе паказана 160 цэнтн. на справе — 245.

«Чырвоны Цяшкаў» атрымаў заданьне здаць бульбы пралетарскім цэнтрам у разьмеры 200 тон. Засеяна было бульбай 60 га, паводле ўліку ўраджай складае каля 600 тон. Між тым **Кухнавец** прыступіў раней да складаньня розных, яўна раздутых, фоцдаў, а плян здачы бульбы паклаў пад сукно.

Праўленьне калгасу ідзе на паваду ў кулацка-заможных элемэнтаў, якія распальваюць дробна-буржуазныя, рвацкія тэндэнцыі ў калгасах і імкнуцца ўзарваць калгас з сярэдзіны.

Мы патрабуем ад Нараўлянскага райкалгассаюзу і раённых арганізацый неадкладнага роспуску праўленьня калгасу, адданьня пад суд кулацкіх агентаў і правядзеньня шырокай растлумачальнай работы ў калгасах, у мэтах поўнага выкананьня іх абавязкаў перад дзяржавай.

Ф. А.

Ігнаруюць першачарговую задачу калгасаў

КРУПКІ. Калгас «Чырвоная зорка» (Траяшоўскі сельсавет) з вызначаных яму 7 цэнт. збожжа на здаў дзяржаве ні аднаго. Калгас імя Чарвякова здаў толькі 4 проц. пляну. У гэтым калгасе знаходзіцца гаспадарка заможніка Кухрашова, які па цьвёрдых заданьнях павінен быў здаць дзяржаве каля 3-х тон бульбы і звыш 30 цэнт. жыта. Па сёньня ён здаў толькі 64 клг.

Старшыня калгасу «Перамога» (Жаберацкі с. с.) **Цыкляронак** катэгарычна адмовіўся здаць дзяржаве лішкі ў разьмеры 75 цэнтн. жыта.

Прыведзеныя факты гавораць аб вельмі слабой масавай рабоце ў радзе калгасаў Крупчыны, аб тым, што ў іх не вядзецца рашучай барацьбы з рэвацкімі, спажывецкімі настроямі, якія распальваюцца кулацтвам.

Яны ашчэ гавораць і аб тым, што раённыя арганізацыі Крупчыны ашчэ не даюць рашаючага адпору махравым апартуністым тыпу Цыкляронка.

В.

На перадавых пазыцыях збожжазагатоўчага фронту

ШКЛОЎ. (наш. кар.) Як арганізацыі Шклоўшчыны выконваюць пастанову ЦК КП(б)Б аб загатоўках? На гэта пытаньне даюць адказ наступныя лічбы. Шклоўшчына на 15 лістапада дала 55,6 проц. пляну, з іх адпаасобны сэктар здаў 42,2 проц.

Калгасы Шклоўшчыны да 15 лістапада перавыканалі плян здачы збожжа (152,3 проц.). Паасобныя калгасы паказваюць узорныя прыклады выкананьня абавязкаў перад дзяржавай. Калгасы Александрыйскага сельсавету здалі 342,5 проц. гадавога пляну, Загаранскага сельсавету — 254,7 проц., Славенскага — 347 проц., Нічыпораўскага — 214 проц. Гэтыя калгасы наглядна паказваюць, што асноўная ўмова посьпеху — разгорнутая масавая работа і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Толькі на гэтай падставе перадавыя калгасы дабіліся перамогі. Там, дзе гэта работа не праведзена, кулак знаходзіць спрыяючую глебу для сваёй агітацыі. Калгасы Яганаўскага сельсавету выканалі 23,6 проц., Уланаўскага — 19,1 проц., Каміна-Лаўскага — 39,6 проц. Партыйныя арганізацыі гэтых сельсаветаў не паставілі барацьбы за збожжа ў цэнтр сваёй увагі, ня злучылі гэтай работы з задачай арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Шклоўшчына дабілася пэўных посьпехаў у збожжазагатоўках. Гэтыя посьпехі павінны быць замацаваны і пашыраны на ўсю калгассыстэму раёну. Трэба падцягнуць работу ў адпаасобным сэктары; рашуча ўдарыць па праявах кулацка-спажывецкіх тэндэнцый ў паасобных калгасах.

Н.

Да Усебеларускай партнарады па пытаньнях мастацтва

Заваяваць вышыні пралетарскага мастацтва

В. ВОЛЬСКІ

На аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, працоўныя БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, дасягнулі значных посьпехаў у галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Адным з яркіх доваду гэтых дасягненьняў зьяўляецца пяцігадовае існаваньне і работа Другога Беларускага Дзяржаўнага Тэатру.

БДТ-2 мог стварыцца і вырасьці ў моцную мастацкую адзінку **толькі** ў выніку **Кастрычніцкай рэвалюцыі, толькі** пры савецкай уладзе.

Але малады БДТ-2 у пэрыяд сваёй студыйнай вучобы і першых крокаў ужо самастойнага тэатру, з прычыны нацыёнальскага свайго кіраўніцтва ня служыў справе рабочае клясы, ня выконваў задач культурнай рэвалюцыі.

Рэпэртуар яго складаўся з матар'ялу, адарванага ад сапраўднасьці, поўнага містыкі і сымболікі, з мастацкай трактоўкай, разьлічанай на задавальненьне ідэйных запатрабаваньняў нацыяналістычных колаў беларускай інтэлігенцыі. Пастаноўкі гэтага часу (**«Цар Максімільян», «Сон у летнюю ноч», «Зрос і Псыха», «Апраметная», «Бакханкі» і інш.**) былі наскрозь пранікнуты **варожай ідэалёгіяй.**

У 1928 годзе БДТ-2, пры дапамозе ўраду і партыйнай грамадзкасьці, дабіўся некаторага **пералому** ў сваёй рабоце. Нацдэмаўскае кіраўніцтва было зьмешана. Тэатр эрабіў паварот да сучаснасьці, да рабочага гледача. У гэты час БДТ-2 паставіў п'есы **«Разлом» № Лаўрэнсва, «Калі сьпяваюць пеўні» — Юр'іна, «Рэйкі гудуць» і «Горад вятроў» — Кіршона, «Авангард» — Катаева.**

З арыгінальных беларускіх — **«Надвесьні» — Ільінскага і «Простыя сэрцы» Рэвэнка і Міцкевіча.**

Паварот гэты абмежаваўся з нават **ад толькі падбораю рэпэртуару,** — БДТ-2 пачаў упяршыню працаваць над савецкай тэматыкай. Але ўсё астатняе — мастацкія навыкі, формы і мэтады працы, трактаваньне роляй і вобразаў — засталося такім, як і раней. Таму, напрыклад, у такой пастаноўцы, як «Горад вятроў» (1929 год), гучаць у спэцічнай трактоўцы пазытыўных вобразаў варожыя ноткі, якія сьведчаць аб рэшткох старой спадчыны. Патрэбна была рашучая арганічная ломка, перабудова ўсёй сыстэмы і мэтадаў работы тэатру, «пераацэнка пэнасьцяй».

Сэзон 1930-31 году, праведзены тэатрам у Менску, меў для БДТ-2 вялікае значэньне. Гэты сэзон даў рашучыя зрухі ў творчым і грамадзкім жыцьці тэатру, навіраваныя на аўладаньне і замацаваньне новых ідэалёгічна-мастацкіх вышынь па шляху зматаньня за сацыялістычную рэканструкцыю беларускага. тэатральнага мастацтва.

Тэатр значна вырас, мастацкі і палітычна актывізаваўся. Адмятаючы ўсёй рэакцыйнай нацдэмаўскай спадчыны, тэатр упарта шукае новых мэтадаў работы, новых форм выхаваньня працоўных мас, сувязі з фабрыкамі і заводамі.

Даны этап разьвіцця адзначаецца тым, што тэатр, задавальняючы культурныя патрэбы рабочых і калгасных мас, у сваю чаргу, **запазычае ў іх мэтады і тэмпы барацьбы за сацыялізм.** Сацпаборніцтва, ударніцтва, работа над пастаноўкамі разам з рабочымі брыгадамі — усё гэта арганічна ўвахопіць у вытворчы быт тэатральнага калектыву.

Тэатр здолеў у асноўным перабудавацца, зьмяніў мэтад вытворчай працы, устанавіў шчыльную сувязь з рабочай грамадзкасьцю. Распачалася барацьба за плянавы падбор актуальнага палітычна-завостранага рэпэртуару. Прыкладам гэтага могуць служыць пастаноўкі **«Першая конная» і «Качагары».** Абедзьве пастаноўкі былі зьвязаны з поўнымі праяўленьнямі клясавай барацьбы вакол і ўнутры тэатру і нямала спрыялі палітычнаму загартаваньню БДТ-2.

Пастаноўка «Першай конная» была тэатрам дапасавана да дэкады абароны краіны. Гэта была першая пастаноўка, прысьвечаная ваяпізацыі, бо да гэтага часу БДТ-2 ня меў ні адной п'есы з жыцьця Чырвонай армії.

П'еса рыхтавалася пры непасрэдным актыўным удзеле і кансультацыі вайсковых работнікаў, былых удзельнікаў паходаў Першай конная. Пастаноўка карысталася вялікім посьпехам. Яна прайшла ў Менску больш як 50 раз засаб. Тэатр абслужыў ёю каля 40.000 гледачоў, з іх 8.000 чырвонаармейцаў. Недарма палітадзел №-скай кавалерыйскай дывізіі адзначыў у друку, што **«ў справе шэфскага абслугоўваньня часьцей Чырвонай армії, БДТ-2 стаіць на першым месцы, зьяўляючыся прыкладам для ўсіх шэфскіх арганізацый»** і што **«саюз работнікаў мастацтва можа ганарыцца сваім калектывам акторaў і працаўнікоў БДТ-2 таксама, як ім ганарацца часьці кавалерыйскай дывізіі».**

Тое самае адзначыў і Асоавіяхім БССР. Ганаровы чырвоны сьцяг, атрыманы БДТ-2 ад дывізіі за вялікую работу на шэфстве і за шчыльную сувязь з Чырвонай арміяй, восем адрасоў ад асобных вайсковых часьцей, масавыя дадатныя водгукі рабкораў аб пастаноўцы, сьведчаць аб тым, што громадзка-палітычныя задачы, зьвязаныя з гэтым паказам, БДТ-2 цалкам выканаў.

Наступным крокам была праца над «Качагарамі», якая афармлялася зусім новымі для тэатру мэтадамі. Праца над ёй была разгорнута на падставе сацдагавору, заключанага паміж аўтарам, рэжысэрам, акторскім калектывам, рэдакцыяй газэты «Рабочий» і брыгадамі, якія былі добраахвотна створаны культактывам паасобных прадпрыемстваў.

Рабочыя брыгады прымалі актыўны ўдзел у рабоце над гэтай п'есай. Пастаноўка «Качагараў» выклікала вялікую зацікаўленасьць да тэатру з боку рабочых мас і грамадзкасьці. Палітычнае значэньне яе для тэатру надзвычай высокае, ня гледзячы на бязумоўную наяўнасьць у п'есе цэлага раду істотных памылак і недахопаў.

Адным з канкрэтных дасягненьняў БДТ-2 у мінулым сэзоне трэба таксама лічыць удала праведзенае падарожжа ў Маскву і Ленінград. Мэтай гэтага першага для БДТ-2 выезду за межы БССР было азнаямленьне шырокіх працоўных мас Масквы і Ленінграду з мастацка-палітычнымі дасягненьнямі БДТ-2, а таксама абмен творчым і культурным вопытам з адпаведнымі тэатрамі РСФСР. Гастролі ўзбагацілі творчы і арганізацыйны вопыт БДТ-2, спрыялі яго далейшаму росту, папулярызавалі дасягненьні нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР.

Уступаючы ў сэзон 1931-32 году, БДТ-2 шчыльна падыйшоў да новага, **вышэйшага этапу** свайго разьвіцьця. Гэты этап высоўвае перад тэатрам неабходнасьць вырашэньня раду новых адказных задач.

Адной з самых першачарговых задач зьяўляецца вырашэньне праблемы **арыгінальнага пралетарскага рэпэртуару.** Без актыўнага ўплыву па стварэньне і замацаваньне за сваёй сцэнай нацыянальнага пралетарскага рэпэртуару, немагчымы палітычны рост і пасьпяховае разьвіцьцё кожнага з нацыянальных тэатраў.

Асабліва востра стаяла перад БДТ-2 гэта праблема на працягу мінулага сэзону. Дзякуючы тагдэшнім керапрыемствам (тэматычныя заданьні, сумесная праца тэатру разам з аўтарамі, мэтадалёгічная кансультацыя, матар'яльная дапамога з боку тэатру і г. д.), якія далі нам зараз эфэктыўныя вынікі, праблема рэпэртуару будзе ў значнай ступені вырашана на працягу бягучага сэзону.

Пасьля п'есы «Качагары», БДТ-2 распачаў працу над чарговай пром'ерай — над п'есай **«Напор»**, напісанай па заказе і пры дапамозе БДТ-2 пралетарскім пісьменьнікам **А. Александровічам.** Задача п'есы — паказаць ролю камсамолу на вытворчасьці ва ўмовах разгорнутай барацьбы за пабудову сацыялізму. «Напор» будзе першай пастаноўкай, прысьвечанай камсамолу БССР.

Адначасова з працай над «Напорам», БДТ-2 падрыхтоўвае для сцэнічнага афармленьня п'есу **Якуба Коласа «Вайна да пабеднага канца»,** напісаную аўтарам таксама пры кансультацыйным удзеле тэатру. Таксама пішуць для БДТ-2 п'есы **В. Сташэўскі** (тэма: сацыяльная сатыра на фоне эканамічнага крызісу капіталізму), **М. Ільінскі** (тэма: праблема серапняка ў калгасе), **Р. Кобец** (тэма: нараджэньне новага чалавека на ўмовах будаўніцтва новага грамадзкага ладу).

Такім чынам, калі намечаны рэпэртуарна-вытворчы плян будзе цалкам выканан, дык БДТ-2 будзе мець па чарзе 5 арыгінальных пастановак, з іх чатыры напісаныя маладымі аўтарамі, членамі БелАПП'у.

Пасьпяховасьць барацьбы за стварэньне пралетарскага арыгінальнага рэпэртуару немагчыма без паглыбленьня і пашырэньня сувязі тэатру з беларускай пралетарскай літаратурай. Таму БДТ-2 ня ўмець адной з задач бягучага сэзону — **замацаваньне творчых і мэтадалёгічных сувязей з беларускай літаратурнай грамадзкасьцю і ў прыватнасьці з авангардам яе — БелАПП'ам.**

Творчыя прынцыпы БДТ-2 заключаюцца ў суцэльнай працы разам з аўтарам. Тэатр шукае шчыльнага яднаньня з пралетарскім драматургам на глебе агульнага творчага працэсу.

Галоўнай мэтай БДТ-2 зьяўляецца ператвараньне сябе ў **пралетарскі беларускі тэатр,** усе творчыя дамаганьні якога былі-б накіраваны на мастацкае сьцьвярджэньне на сцэне генеральнай лініі партыі. Гэта немагчыма без аўладаньня новым творчым мэтадам, мэтадам пралетарскага тэатру.

За апошні час, уключыўшыся ў барацьбу за пралетарскае мастацтва, БДТ-2 адкінуў у сваёй творчай працы найбольш рэакцыйныя элемэнты ідэалістычнай школы Станіслаўскага, але рэшткі яе ашчэ захавіліся (у «Горад вятроў»).

Барацьба за мэтад **дыялектычнага матар'ялізму** зьвязана з **перавыхаваньнем** старых акторскіх і рэжысэрскіх кадраў, якія раней былі пад уплывам нацдэмаў, а цяпер зразумелі свае памылкі і жадаюць працаваць разам з пралетарыятам. Уся гэта барацьба і работа разгортваецца на базе пашырэньня непасрэднай сувязі з рабочым гледачом, з фабрыкамі, заводамі і калгасамі ў форме шэфства над тэатрам з боку паасобных прадпрыемстваў, арганізацый ў тэатры агітгруп, якія непасрэдна зьвязаны з вытворчасьцю і працуюць на мясцовым матар'яле, шэфства добраахвотных рабочых брыгад над паасобнымі пастаноўкамі.

Для большай пасьпяховасьці ў рабоце зьяўляецца зусім неабходнай творчая сувязь і абмен вопытам з іншымі тэатрамі Савецкага Саюзу. БДТ-2 выклікае па сацпаборніцтва Цюркскі дзяржаўны мастацкі тэатр (Баку) і украінскі тэатр «Березіль» (Харкаў), як найбольш блізкія яму па мастацкай падрыхтоўцы і агульных працэсах разьвіцьця.

Наглядаецца ў нас таксама невыстарчальная сувязь паміж паасобнымі тэатрамі БССР. **Чаму-б, напрыклад,** не арганізаваць нам усебеларускую **алімпіяду тэатраў і самадзейнага мастацтва?** Правядзеньне такога мерапрыемства ўсьпяло-б на вышэйшую ступень справу спаборніцтва і творчай сувязі паміж паасобнымі атрадамі культурнага будаўніцтва БССР, а з другога боку, спрыяла-б ліквідацыі існуючага ашчэ разрыву паміж прафэсыянальным тэатрам і самадзейным мастацтвам.

Канкрэтна варта было-б прызначыць усебеларускую алімпіяду на лета 1932 году.

Наступнай ударнай задачай для БДТ-2 зьяўляецца **падрыхтоўка і ўсебаковае выхаваньне кадраў.** Для вырашэньня гэтай праблемы БДТ-2 пайшоў па шляху пазнаўленьня свайго акторскага складу рабочым маладнякам, за лік найбольш здольных прадстаўнікоў самадзейнага мастацтва.

У мэтах тэарытычнай падрыхтоўкі кадраў, БДТ-2 стварыў спачатку гэтага сэзону тэатральны фабзавуч, на якім зараз навучаецца 20 чалавек. На прыкладзе пралетарскай літаратуры, БДТ-2 лічыць сваёй задачай (і частковa праводзіць у жыцьцё) **заняць у тэатр рабочых-ударнікаў.**

Сэзон 1931-32 году зьвязан, між іншым, з пяцігадовым юбілеем існаваньня БДТ-2 у якасьці самастойнага тэатру і з 10-годзьдзем стварэньня студыі.

Гэты юбілей павінен быць праведзены пры актыўным удзеле рабочых мас, пад знакам **паглыбленьня** непасрэднай сувязі тэатральнага калектыву з рабочым гледачом. Правядзеньне юбілею павінна быць выкарыстана ў мэтах шырокай прапаганды перамог ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Апрача таго, сьвяткаваньне юбілею будзе зьвязана для БДТ-2

Аб прозвецы выкананьня органамі КК-РСІ пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б)

Пастанова прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК РСІ СССР ад 15 лістапада 1931 году

МАСКВА, 22. У мэтах правяраньня пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб чыгуначным транспарце, аб разгортваньні сапраўднага гандлю і паляпшэньні снабжэньня рабочых, ЦКК НК РСІ СССР прапануе апэрацыйным групам пэрыферыі і мясцовым органам КК-РСІ арганізаваць систэматычную праверку і забесьпячэньне выкананьня гэтых пастаноў. Рэспубліканскім, краявым, абласным КК-РСІ неабходна абмеркаваць плян мерапрыемстваў аб рэалізацыі гэтых пастаноў, намеціўшы, у адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі, канкрэтныя абъекты работы як для рэспубліканскіх, краявых, абласных, так і для раённых КК РСІ.

I. Па чыгуначным транспарце.

1) **Групе транспартнага машынабудаўніцтва** праверыць работу заводаў, якія выконваюць заказы чыгунак на паравозы, цэпланвозы, вагоны і запасныя часткі, скарыстаньне вытворчай магутнасьці заводаў і забясьпечанасьць іх мэталем, а таксама мерапрыемствы, якія намячаюцца для рэканструкцыі і спэцыялізацыі заводаў.

2) Даручыць ЦКК НК РСІ Украіны, уральскай, маскоўскай, ленінградзкай, абласным КК РСІ і Ніжагародзкай крайКК-РСІ ўстанавіць систэматычны нагляд за работай заводаў, што выконваюць заказы чыгуначнага транспарту, прычым ЦКК-РСІ Украіны асаблівую ўвагу аддаць работе па рэканструкцыі луганскага паравозабудаўнічага заводу.

3) **Групе чорнай мэталургіі**, сумесна з групай машынабудаўніцтва, устанавіць нагляд за пастаўкай заводамі НКТЗ запраставанай на IV квартал колькасьці рэек, падкладак, накладак, кастылёў і абсталяваньня для вадаснабжэньня; праверыць мерапрыемствы ВСНГ СССР па выпраўленьні вырабу рэек для выкананьня навялічанай праграмы на 1932 год.

4) **Групе электрапромысловасьці** праверыць выкананьне прамысловасьцю заказаў транспарту для работы па электрыфікацыі раду чыгунак, намечанай ліцэнскім пленумам ЦК УсеКП(б) і пастаўку НКПС неабходнага электраабсталяваньня і матэрыялаў для паляпшэньня сувязі важнейшых вузлоў і напрамкаў.

5) Даручыць цэнтральнай інспэкцыі транспарту і сувязі пасьля зацьвярджэньня СНК плану рэканструкцыйных работ на чыгуначным транспарце, распрацаваць мерапрыемствы па забесьпячэньні з боку органаў КК-РСІ ў цэнтры і на месцах праверку ажыцьцяўленьня гэтага пляну.

6) **Групе культуры і падрыхтоўкі кадраў**, сумесна з цэнтральнай інспэкцыяй транспарту і сувязі, з краявымі, абласнымі КК-РСІ, праверыць становішча работы па падрыхтоўцы чыгуначных кадраў праз ВТНУ, тэхнікумы і шляхам перакваліфікацыі, без адрыву ад работы.

7) Даручыць мясцовым КК УсеКП(б) праверыць выкананьне партыйнымі арганізацыямі пастановы пленуму ЦК УсеКП(б) аб умацаваньні транспарту партыйнымі кадрамі, асабліва ўжо пізавых зьвольнях, паведаміўшы аб результатах ЦКК НК РСІ да 15 студзеня 1932 году.

8) Прэзыдыум ЦКК абавязвае мясцовыя КК-РСІ ў работе на лініі транспарту канцэнтраваць увагу на выкананьні пляну і зьніжэньні сустрэчнасьці перавозак, замацаваньні спаранай язды, зьніжэньні абязьлічкі вагонаў, скарыстаньні ўнутраных рэсурсаў, ліквідацыі ўхіляньняў ў аплаце працы і ўзьвяшчэньні працоўнай дысцыпліны.

9) Прапанаваць мясцовым КК-РСІ неадкладна ўмацаваць кваліфікаванымі работнікамі групы па чыгуначным транспарце ў складзе органаў КК-РСІ, пасьлядоўна на чале гэтых групаў членаў прэзыдыуму КК або калегіі РСІ.

II. У галіне разгортваньня савецкага гандлю і паляпшэньня снабжэньня.

1) **Групе снабжэньня і каапэрацыі** і мясцовым органам КК-РСІ ўстанавіць систэматычную праверку размяшчэньня сеткі, якасьці работы гандлюючых арганізацый у справе паляпшэньня абслугоўваньня пакупцоў, зьніжэньня цэн, спэцыялізацыі гандлю, падбору абслугоўваючага персаналу, паскарэньня тавараабароту, ліквідацыі практыкі механічнага размеркаваньня прамтавараў і прадуктаў спажываньня.

2) **Групе снабжэньня і каапэрацыі НК РСІ РСФСР** праверыць гэтую падрыхтаванасьць і ходу разгортваньня разгорнутай гандлёвай сеткі аб'яднаньнямі лёгкай прамысловасьці, саюзнымі і каапэрацыямі аб'яднаньнямі, прамкаапэрацыяй; на аснове гэтага даць заданьне мясцовым КК-РСІ аб праверцы на месцах фактычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў пленуму ЦК аб гандлі ўказаных арганізацый прадуктамі ўласнага вытвэрства.

Заслухаць у сьнежні 1931 году даклады 2-3 абласных і краявых КК РСІ аб ражортаваньні саўгасамі і калгасамі гандлю прадуктамі ўласнага вытвэрства.

3) **Групе снабжэньня і каапэрацыі РСІ Саюзу**, уральскай, заходняй, сібірскай, украінскай, маскоўскай і ленінградзкай КК-РСІ праверыць у сьнежні 1931 году выкананьне дырэктывы пленуму ЦК аб стварэньні харчовых баз і розэрваў для бесьперабойнага снабжэньня важнейшых прамысловых раёнаў.

4) **Групе снабжэньня і каапэрацыі НК РСІ РСФСР** устанавіць систэматычны нагляд за выпускэньнем у цэнтры харчовых і прамтаварных фондаў для рабочых раёнаў.

Абавязаць мясцовыя КК-РСІ ўстанавіць кантроль за давядзеньнем да рабочага спажыўца ўстаноўленых фондаў поўнасьцю, не дапускаць скарыстаньня гэтых фондаў не па прызначэньні і аб парушэньнях у гэтай галіне паведамляць ЦКК РСІ.

5) Заслухаць на прэзыдыуме ЦКК УсеКП(б) у студзені 1932 году даклад аб рабоце транспартнай каапэрацыі з сучакладам групы снабжэньня і каапэрацыі НК РСІ Саюзу, ЦКК РСІ Украіны, Заходня-Сібірскай КК-РСІ.

6) Рэспубліканскім, абласным і краявым КК-РСІ выпучыць спэцыяльных работнікаў для пастаяннага нагляду за выкананьнем гандлюючымі арганізацыямі дырэктыўных указаньняў аб цэнах.

У студзені 1932 году заслухаць даклад інспэкцыі цэн НК-РСІ Саюзу аб выкананьні гандлёвай сеткай савецкай палітыкі цэн.

7) Даручыць мясцовым КК-РСІ ўстанавіць систэматычны нагляд за работай органаў грамадзкага харчаваньня, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на папярэдняе і абсталяваньне сеткі і на разьвіцьцё пры фабрычна-заводзкіх сталовых дапаможных прадпрыемстваў, сьвінарнікаў, гародаў і інш.

Групе грамадзкага харчаваньня і НК РСІ РСФСР праверыць дзейнасьць Нархарчу, «Всекопита» і прамысловасьці на разьвіцьці і забесьпячэньні інвэнтаром і абсталяваньнем усіх грамадзкіх сталовых, і на новым будаўніцтве на 1932 год.

8) Вылучыць спэцыяльную камісію прэзыдыуму ЦКК-РСІ тэрмінам на 2-3 месяцы для распрацоўкі і прыняцьця раду канкрэтных мер па паляпшэньні якасьці прадукцыі шырокага спажываньня.

Абавязаць мясцовыя КК РСІ ўзяць пад асабліваю нагляд прадпрыемствы лёгкай прамысловасьці, якія выпрацоўваюць прадметы шырокага спажываньня, вялучы рашучую барацьбу за якасьць прадукцыі, шырока мабілізуючы вакол гэтага прафсаюзы, сэкцыі саветаў і саміх арганізаваных спажыўцоў.

9) Даручыць мясцовым КК-РСІ систэматычна правяраць работу органаў снабжэньня і каапэрацыі па адпусканьні ім мясцовых харчовых рэсурсаў: дэцэнтралізаваных загатоўкі, самазагатоўкі, арганізацыя рынкаў з удзелам калгасаў і саўгасаў, разьвіцьцё дапаможных прадпрыемстваў пры каапэрацыйных арганізацыях.

10) **Групе культуры і падрыхтоўкі кадраў і НК РСІ РСФСР** праверыць работу Наркамсобесу і Цэнтрасаюзу па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў шляхам арганізацыі ВТНУ, курсаў на гандлёвай справе і выкананьне дырэктывы аб стварэньні для спэцыялістаў і тэхнікаў гандлёвай справы такіх-жа ўмоў работы, як і для спэцыялістаў прамысловасьці.

III.

1) Прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ прапануюць мясцовым КК РСІ сваім актыўным удзелам забясьпечыць свачасовае і поўнае выкананьне плянаў сельска-гаспадарчых загатовак, рашуча праціўстаючы кулацкім уплывам, накіраванага на зрыў дзяржаўных мерапрыемстваў.

2) Абавязаць мясцовыя КК-РСІ забясьпечыць пастаянны нагляд за якасьцю сельска-гаспадарчай прадукцыі, якая загатаўляецца (хлеба, мяса, гародніны і інш.), за транспартаваньнем і хаваньнем іх, вядучы рашучую барацьбу з нядбайнымі адносінамі загатоўшчыкаў да прыёму недобракачэснай прадукцыі, з безгаспадарчым хаваньнем прадуктаў, што выклікае іх псаваньне, асабліва гародніны, з цягненай на заводзе прадуктаў.

3) Прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ прапануюць органам КК РСІ мабілізаваць увагу і актыўнасьць шырокіх рабочых мас, партыйнага і беспартыйнага рабочага і калгаснага актыву па выкананьне дадзенай пастановы, уцягнуць у гэту работу групы садзейнасьці РСІ на транспарце, у прадпрыемствах і калгасах, сэкцыі саветаў, каапэрацыйную грамадзкасьць, крамныя камісіі і шэфствуючыя заводы.

Уключаемся ва ўсесаюзны рэйд за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна

«Зьвязда» заклікае ва ўсесаюзны рэйд ударных брыгад ЦК, абраных ЦКК-РСІ і рэдакцыяй «Правды», за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна і пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б).

Ударныя брыгады «Зьвязды» праверуць рад прадпрыемстваў мэталапрадуючай, рэзаапрадуючай, шэйнай, тэкстыльнай і гарбарна-абутковай прамысловасьці, новабудоўлі і чыгуначны транспарт у Менску, Гомелі, Віцебску.

Рэйд-паход будзе праходзіць з 27 лістапада на 15 сьнежня 1931 году.

Выклікаем цэнтральныя і рабочыя газэты БССР.

АПЭТЫТЫ ЯПОНСКІХ АКУПАНТАЎ РАСТУЦЬ

Скандальны правал антысавецкіх правакатараў

Акупанты рыхтуюцца да захвату Цзіньчжоў

БЭЙПІН, 23. Паводле паведамленьня газэт, японскія арміі пасьля захвату Цыцыкара рыхтуюцца да атакі Цзіньчжоў. Японскія арміі з Мукдэну пачынаюць рухацца на захад.

БЭЙПІН, 23. Харбінская японская газэта «Ніцы-Ніцы» паведамляе: «Штаб японскіх квантунскіх войск абвясьціў, што бярэ на сабе клопаты аб захове «парадку і супакою» ў Харбіне».

Ліга нацый узаканьвае акупацыю Манчжурыі

ПАРЫЖ, 22. Апазьваючы дэбаты рады Лігі нацый па япона-кітайскім канфлікце тав. Перы ў «Юманітэ» заўважае: «камісія Лігі нацый для вывучэньня становішча па месцы зьяўляецца зброяй, якую Ліга над кіраўніцтвам французкага імпэрыялізму, дае ў рукі японскага ўраду для барацьбы супроць савецтаў за ўсім Кітаі. Ліга нацый узаконьвае акупацыю Манчжурыі Японіяй». (ТАСС).

ШТАБ АКУПАНЦКАЙ АРМІІ — крыніца правакацыйнай антысавецкай хлусьні

МУКДЭН, 22. Сёньня раніцой адбылася нарада прадстаўнікоў замежнага друку сумесна з прадстаўніком штабу і камандуючым японскай акупацыйнай арміяй у Манчжурыі Хандзіо.

Надзвычай рэзкую сэнсацыю выклікала пытальне замежных карэспандэнтаў аб тым, як растлумачыць прадстаўнік генэрала Хандзіо адказ японскага ўраду на ноту Літвінава? У гэтым адказе японскі ўрад заяўляе, што ён верыць чуткам аб дапамозе, якая аказваецца савецкім урадам якія-бы там ні было кітайскім генэралам і, што «ён катэгарычна заяўляе, што ня можа быць і гутаркі аб тым, што японскія канвульсіі і васкныя ўлады выдумваюць чуткі і пашыраюць іх праз друк і тэлеграфныя агэнцтвы».

Замежныя карэспандэнты, асабліва карэспандэнты «Нью-Ёрк Таймс» і «Юнайтэд Прэс», зазначылі, што такая заява японскага ўраду ставіць іх у становішча брахуноў, паколькі яны паведамлялі за граніцу аб катэгарычных заявах генэрала Хандзіо аб дапамозе, якую быццам аказвае савецкі ўрад генэралу Ма.

На нарадзе высьвятлілася, што 13-га лістапада ў 6 гадзін вечара карэспандэнт «Нью-Ёрк Таймс» гутарыў з генэралам Хандзіо, прычым галоўнакамандуючы заявіў, што «ўпэўная дзяржава «ўмацаньне супраціўленьне Кітая». Карэспандэнт сьцьвярджае, што Хандзіо гаварыў аб тым, што «ў кітайскай арміі зьявіліся зэнітныя гарматы і што з подачнага часу заўважаецца наляпшэньне стральбы кітайскай артылерыі».

Апрача таго, заяўляе карэспандэнт, Хандзіо дадаў: «з прыбыцьцем у Паўночную Манчжурыю кітайскіх і карэйскіх камуністаў і атрадаў «інтэрнацыянальнай арміі», у манчжурскай абстаноўцы зьявіліся новыя элементы вялікага ваеннага і палітычнага значэньня, элементы, якія вітаўочна распаўсюджваюцца на ўсім Кітаі і якія ні Японія, ні іншыя краіны ня могуць ігнараваць».

(ТАСС).

Генэрал Ма снабжаўся зброяй з Дайрэну

БЭЙПІН, 21. Мясцовая прэса ў Дайрэне вельмі асьцярожна пачала выкрываць справу транспарту зброі з Дайрэна для кітайцаў у Манчжурыю. Паводле вестак, галоўным арганізатарам дастаўкі зброі кітайцам зьяўляецца транспартная кантора Кокусэйуньюй. Гэта кантора мае вялікую сетку сваіх філіялаў па мясцовай чыгунцы, мытні і іншых транспартных канторах. Зброя адпраўлялася ў вялікай колькасьці праз Харбін генэралу Ма. Ваенныя прымаюць меры, каб выратаваць удзельнікаў. Ня выключана магчымасьць, што частка зброі ўзята з ваенных складаў. (ТАСС).

Захватніцкія апэтыты японскіх сацыял-інтэрвэнтаў

ТОКІЁ, 23. Японская сац.-дэмакратычная партыя Сакай Мінаюта ў рэзалюцыі па манчжурскім пытаньні ўскладае ўсю адказнасьць за абвастрэньне манчжурскага пытаньня ў першую чаргу на Кітай, які вядзе «бяспрынцыпную» і систэматычную антыяпонскую кампанію. Японская сац.-дэмакратыя ў сваёй рэзалюцыі гавора: «Партыя катэгарычна адхіляе ўсякую спробу парушэньня ў Манчжурыі і Манголіі японскіх праў і інтарэсаў, якія забясьпечаны дагаворамі». Сац.-дэмакраты матывуюць свой пункт гледжаньня «неабходнасьцю ўключэньня Манчжурыі і Манголіі ў склад Японіі для стварэньня сацыялістычнай Японіі ў рамках дзяржаўнага сацыялізму».

Былы кітайскі імпэратар у ролі „прэзыдэнта" Манчжурыі

ТОКІЁ, 23. Оімбун Рэнго з Мукдэну паведамляе, што ўрад Юань Цзін-ляя 25 лістапада апублікуе дэкларацыю аб падпарадкаваньні адзінай уладзе Гірыня, Хэйлунцзяна і Мукдэна. Чакаюць, паведамляецца далей, што Тап Юйлін (кіраўнік «незалежнага» ўраду ў Жэхе) таксама далучыцца да гэтага аб'яднаньня. Формай праўленьня намечаецца рэспубліка, той-жа час распаўсюджваюцца чуткі, што першым «прэзыдэнтам» будзе Пу І (былы кітайскі імпэратар).

Балбатня аб разбраеньні і сапраўднасьць

ПАРЫЖ. Гэтымі днямі з вялікай помпай зьбярэцца ў Парыжы кангрэс «прапагандыстаў міру і разбраеньня». Толькі-што Ліга нацый абвясьціла пакт аб пераміры ва ўзбраеньнях, які ўступіў у моц. Ідзе шумная падрыхтоўка да надыходзячай канфэранцыі па разбраеньні. Дасканалай інфармацыяй да «разбраенчых» імкненьняў французкага імпэрыялізму зьяўляецца прамова Фабры.

Як вядома, нямецкі вайсковы міністар Грэнэр гэтымі днямі ў сваім выступленьні патрабаваў прызнаньня прынцыпу роўнапраўнасьці ва ўзбраеньнях для Германіі. Неадкладна-ж пасьледваў ясны і недвузначны адказ з боку Францыі. Старшыня вайсковай камісіі палаты дэпутатаў Фабры выказаў прамову ў Бозансоне, у якой рашуча абвергнуў пратэнзіі Нямеччыны на роўнапраўнасьць.

Аргумэнты Фабры зводзяцца вось да чаго: ня можа быць сапраўднай роўнапраўнасьці паміж дзьвюма дзяржавамі, у якіх розная нацыянальнасьці насельніцтва, розная прамысловая база, розная геаграфічнае становішча. Калі Германія патрабуе роўнапраўнасьці, уплываючы больш магутнай прамысловасьцю, транспартам і г. д., то яна гэтым самым патрабуе перазагі ўзбраеньня ў адносінах да Францыі.

Калі-ж Германія дамагаецца «раўнапраўнасьці ва ўзбраеньні», або ўсеагульнага разбраеньня, дык гэта хімэра. Ваенны капіталізм вызначаецца колькасьцю насельніцтва, выгворчай здольнасьцю прамысловасьці, здольнасьцю вырабляць газы, аэраплены, аўтамабілі і г. д. Але ўсе гэтыя элементы ня могуць быць абмежаваны. Значыцца, Германія, патрабуючы ўсеагульнага разбраеньня, тым самым гаворыць: «чым больш вы раззброены, тым больш узброена я».

Вывады Фабры гэтага ідэолёга французкага імпэрыялізму, які выказвае афіцыяльны пункт гледжаньня ўраду, зводзяцца да наступнага: ФРАНЦЫЯ НЯ МОЖА БЫЦЬ РАЗБРОЕНА; УСЯКАЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ НЯМЕЦКАГА ЎЗБРАЕНЬНЯ ПАВЯДЗЕ ДА НОВАЙ ГОНКІ ЎЗБРАЕНЬКЯЎ І ДА НОВАЙ ВАЙНЫ.

Францыя — гэты вэрсальскі жандар — можа трымацца за ваенную гэгэмонію на эўрапэйскім кантынэнце — ня сьмей яе чапаць. Нямецкі друк з поваду выступленьня Фабры мэлянхалічна заўважае, што «пэрспэктывы канфэранцыі па разбраеньні са дня на дзень становяцца ўсё больш сумнымі».

Па СССР і БССР

Аб бесьперапынным вытворчым тыдні ва ўстановах

Пастанова СНК СССР ад 21-га лістапада 1931 г.

МАСКВА, 23. СНК СССР, лічачы бесьперапынны пяцідзённы вытворчы тыдзень асноўнай формай арганізацыі працы ў СССР, у мэтах выпраўленьня недахопаў, якія мелі месца пры правядзеньні бесьперапыннага вытворчага тыдню ва ўстановах, — пастанаўляе:

1. Пакінуць па бесьперапынным вытворчым тыдні ўстановы, непасрэдна зьвязаныя з абслугоўваньнем бесьперапынна працуючых прадпрыемстваў, а таксама і тыя, якія абслугоўваюць культурна-бытавыя патрэбы шырокіх мас насельніцтва (каапэратывы, дзярж магазыны, сталоўкі, трамваі, аўтабусы, больніцы, вадаправоды, каналізацыя пажарныя каманды, справачныя бюро і г. д.).

2. Дазволіць наркаматам і іншым установам часова пераходзіць на шасьцідзённы перапынны тыдзень.

3. Дазволіць раённым установам пераходзіць на перапынны тыдзень з дазволу СНК саюзных і аўтаномных рэспублік або абласных (краявых) выканкомаў.

4. Устанавіць ва ўстановах, якія пераходзяць на шасьцідзённы перапынны тыдзень, цьвёрдыя выходныя дні па наступных чыслах месяца: 6, 12, 18, 24 і 30.

Заўвага: Замест выходнага дня ў каццы лютага прадаставіць выходны дзень 1-га сакавіка.

5. Пры пераходзе ўстаноў з пяцідзённага на 6-дзённы перапынны тыдзень скараціць рабочы дзень ва ўстановах з 6-30 да 6 гадзін.

6. Устанавіць, што пераход на перапынны тыдзень навінен рабіцца наркаматамі і іншымі ўстановамі пасьля папярэдняй згоды з Народным Камісарыятам Працы або органамі Наркампрацы на месцах і над іх кантролем. Прапанаваць Наркампрацы СССР даць цэнтральным мясцовым органам неабходныя ўказаньні аб парадку пераходу на перапынны тыдзень.

7. Абавязаць установы і арганізацыі, часова перашоўшыя на 6-дзённы перапынны тыдзень, арганізаваць у выходныя дні бесьперапыннае выраўнаўленьне бягучых неадкладных пытаньняў шляхам устанаўленьня дзяжурстваў у адпаведнай частцы апарату і кіруючых работнікаў.

8. Пераход на перапынны шасьцідзённы тыдзень дазволіць з першага сьнежня 1931 г.

Старшыня СНК Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Кіраўнік Справамі СНК Саюзу ССР
П. КЕРЖАНЦАЎ.

Усебеларускі зьезд калгасьніц

25-га лістапада ў Менску склікаецца першы ўсебеларускі зьезд жанчын-калгасьніц. Зьезд адбудзецца ў памяшканьні клюбу харчавікоў.

На зьезд зьяжджаецца 350 лепшых калгасьніц-ударніц і 50 перадавых жанчын-адзіласобніц. У парадку дня зьезду будуць стаяць пытаньні—аб задачах разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, аб пераапрацоўцы і здачы тэхкультур, уцягненьні жанчын у кіраўніцтва калгасамі і г. д.

Агляд работы гарсаветаў

З 20-га лістапада да 5-га сьнежня ЦВК БССР праводзіць агляд работы гарсаветаў у галіне выкананьня пастаноў чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб разьвіцьці камунальнай гаспадаркі.

Чырвоны абоз імя „Правды"

МАГІЛЁЎ. (Белта). Паводле ініцыятывы селькораў Магілёўшчыны, 20-га лістапада быў арганізаваны вялікі раённы чырвоны абоз імя «Правды». Абоз складаўся з 2.000 фурманак. Здана дзяржаве каля 80 тон збожжа, звыш 60 тон бульбы, значная колькасьць ільна-валакна і інш. культур.

Усесаюзны зьезд яўрэйскіх пісьменьнікаў адбудзецца ў Менску

Паводле пастановы ВАПП'у 30-га сьнежня г. г. у гор. Менску адкрываецца ўсесаюзны зьезд яўрэйскіх пралетарскіх пісьменьнікаў.

Літаратурныя арганізацыі БССР разгарнулі шырокую работу па падрыхтоўцы да зьезду. Паводле ініцыятывы віцебскай філіі БелАПП'у, па працяту бліжэйшых дзён арганізуюцца вялікія літаратурныя вечары з выступленьнямі пісьменьнікаў на буйнейшых прадпрыемствах Віцебску.

Для ўдзелу ў гэтых вечарох з Менску выехала спэцыяльная брыгада пісьменьнікаў у складзе: т.т. Брайнштэйна, Харыка, Гордмана і Кацовіча.

„Чырвоны адраджэнец" выканаў прамфінплян

МАГІЛЁЎ. (БЕЛТА). НА АСНОВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ АКТЫЎНАСЬЦІ РАБОЧЫХ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ, ЗАВОД «ЧЫРВОНЫ АДРАДЖЭНЕЦ» ВЫКАНАЎ ПРАМФІН. ПЛЯН ЗА КАСТРЫЧНІК НА 100 ПРОЦ. РАБОЧЫЯ АБАВЯЗУЮЦЦА НАПРУЖЫЦЬ УСЕ СІЛЫ, КАБ РЭАЛІЗАВАЦЬ 6 УМОЎ ТАВ. СТАЛІНА.

Назначэньні

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанавіў назначыць тав. ЛЯХАВА Віктара Аляксандравіча, намесьнікам народнага камісара фінансаў БССР.

* * *

Тав. ДУКЕЛЬСКІ, Сямён Сямёнавіч, назначан намесьнікам старшыні Дзяржаўнай Папітычнай Управы БССР.

Тав. ГАНТМАН, Бэніямін Раманавіч, назначан намесьнікам старшыні нацыянальнай камісіі ЦВК БССР.

У сувязі з пераходам тав. ГЕРШЭЛЬМАНА Эдуарда Яўгеніевіча на іншую работу, ён вызвалены ад абавязкаў дырэктара інстытуту савецкага будаўніцтва і права пры ЦВК БССР.

На яго месца дырэктарам інстытуту назначан тав. ГОХМАН, Станіслаў Маркавіч.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— Дом Камасьвяты. 24/XI ад 7-9 гадзін — індывідуальная кансультацыя па палітэканоміі і японскай мове.

— 25-га лістапада, у 12 гадз. дня скліканая ў Культпроце Менгарсовету камісія па пытаньні: аб актыўным удзеле выкладчыкаў ў ВНУ і ВТНУ. У камісію ўваходзяць з'яўляцца новыя элементы ... Іванкевіч (ЦК Культпроф), ... (Адд. гадзеў ЦК), Герцальман (... тар Сабуўту), Ошмяну (... Кацяка (НДУ педагог.), Шыбін ... інстытут), Цярэнцеў (педінстытут) ... са дапамогаю і без спазьненьня.

24 лістопада — дакład тав. СОЛЬЦА на нарадзе газэтных работн... У аўторак, 24 лістапада, у 6 гадз. веч., у памяшканьні малой залі ЦК ... пром ЦК КП(б)Б скліканае чарговую інструктыўную нараду камуністаў — ... ніку цэнтральных газэт, а таксама рэдактароў фабрычна-заводзкіх ... раёнак г. Менску з удзелам студэнтаў 2-га курсу газэтнага аддзяленьня ... куду. Парадак дня: 1) Даклад члена ... ца—«Работа органаў цэнтральных ... рэдакцый газэт «Калгасьнік Беларусі», «Рабочы», «Рабочы», «Сельгаспрацоўны Беларусі» і ... «Акцябр», «Чырвоная Зьмена», «Рабочы», «Сельгаспрацоўны Беларусі» і ... газэт аб канкрэтных мерапрыемствах гэтых рэдакцый на арганізацыі і ... дзенным Усесаюзнага конкурсу ... газэт, абвешчаны «Праўдой».

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б

Падпісывайцеся сваячасова на сьнежань
і далейшыя месяцы
на цэнтральны орган КП(б)Б—газэту
„ЗЬВЯЗДА"
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на 1 мес.—1 р., 3 мес.—3 руб., 6 мес.—6 руб., на год—12 р.
ПАДПІСКА НА СЬНЕЖАНЬ ПОШТАЙ БУДЗЕ ПРЫМАЦЬ ТОЛЬКІ ДА 26 ЛІСТАПАДА
Не адкладайце здачу падпіскі на апошні дзень

Чырв. Зорка — Пач. 6, 8-20, 10-30 — Гаворачы гукавы фільм ЗЛАТЫЯ ГОРЫ
„КУЛЬТУРА" — Пач. 7, 8-45, 10-30 — 1) Заканчэньне эстраднічны фільм 2) Часопіс Саюзкіно № 63. У СЬВЕЦЕ ПЛЯНЭТ І ЗОРАК
Інтэрнацыянал — Ядар. з 12 г. дня — Вялікае мастацкае фільм Вяльнікі бледнай гары. Апошні шлях—Кіно-нарыс БДК
ПРАЛЕТАРЫ — ГАНДЛЯРЫ СЛАВАЙ — мастацкі баявік у 7 частках.
„Юны Піянэр" (Сутыкі кіно „Культура") — Два фільмы у адзін сэанс 1) Кост праз Вым 2) Паляваньне на Гарылу. Пач. 1г., 2-30. Каса—зд 11 г. дня.
„СПАРТАК" — Каса адкрыта 5г. — З чацьверга, 19 лістапада прыгодніцкі фільм Шчасьлівы Кент драма у 6 ч. Пачатак—1—7,15, 2—9 і 3—10,45.

фота-апарат— НА СЛУЖБУ САЦ. БУДАЎНІЦТВА.
Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА УСІХ ПРАЦОЎНЫХ, ШТО АШЧАДКАСАМІ БССР ПРАВОДЗІЦЦА
РЭАЛІЗАЦЫЯ ФОТААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ,
па якіх трымальнікі апошняга змогуць атрымаць фотаапараты тыпу „ФОТОКОР" № 1, разьмерам 9х12 з адпаведнымі прыладамі.
КОШТ ФОТААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА: 1, 2, 3 сэрый—220 руб. 4, 5, 6 і 7—187 руб.
Кошт фотаабавязацельства аплачваецца ў растэрміноўку да 1-XII—33 г. у залежнасьці ад сэрыі.
Выдача фота-апарату пачынаецца з 1-VII—32 г. Рэалізацыя фотаабавязацельстваў будзе праводзіцца да 1 красавіка 1932 г.
Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР.

1-га сьнежня пачынаецца кампанія зімовай дапамогі.
Да вядома ГК, РК і ячэек МОПР'у.
Цэнтральны камітэт МОПР'у БССР напамінае ўсім арганізацыям і ячэйкам МОПР'у БССР, што кампанія зімовай дапамогі пачынаецца 1 сьнежня і дзіўрмінаван у гэтай кампаніі ня будзе.
Усе сродкі, якія ёсьць па КЗД павінны быць да 1 сьнежня пераведзены ў ЦК МОПР'у БССР.
ЦК МОПР'у БССР зварачаецца да ўсіх гаспадарнікаў і рахункавых працаўнікоў з просьбай перапляціць сумы, якія адлічаны рабочымі і служачымі па падпісных лістах, на агульных сходах і г. д. ГК, РК і ячэйкі, прымеце ўсе меры па выкананьні кантрольных заданьняў па КЗД.
Сродкі, якія паступяць па КЗД пасьля 1 сьнежня, ня будуць залічаецца ў лік гэтай кампаніі, а будуць залічаны, як добраахвотныя ўзносы.
ЦК МОПР'у БССР.

Беларускі дзяржаўны мэдычны інстытут абвяшчае прыём
НА 1-шы КУРС ВЯЧ. ФАКУЛЬТЭТУ.
На санітарна-прафілактычнае аддзяленьне—60 асоб, акмэтнаўладу—30, лечраф.—60.
Правілы прыёму, як і для ўсіх вузаў (даведнік НКА на 1930-31 г.).
Прыём заяў да 15-XII—31 г. Іспыты з 15-XII па 25-XII. Заняткі з 1-I—32 г.
Студэнты вячэрняга факультэту стыпендыяй і інтэрнатам не забясьпечваюцца.
Даведкі аб паступленьні выдаюцца штодзенна ў канцылярыі інстытуту з 4 да 5 гадз. дня.
Дырэкцыя мэдінстытуту.

24 лістапада, у 6 гадз. веч. адкрываецца
III пленум Менскага Гаркому МОПР'у.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Вынікі II пленуму ЦК МОПР'у СССР.
2) Папярэднія вынікі кампаніі зімовай дапамогі.
3) Аб кампаніі рэалізацыі пазыкі „3-га гашэючага".
4) Даклады заводаў „Бальшавік", „Камунар" і друкарні Імя Сталіна.
5) Арганізацыйні.
Пленум адбудзецца ў памяшканьні ЦК МОПР'у, Савецкая, 87.
Усім членам камітэту, прэзыдыуму і рэвізійнай камісіі зьявіцца абавязкова і без спазьненьня. Запрашаецца таксама гар. актыў МОПР'у.
Фракцыя адбудзецца ў 5 гадз.
Сакратар Гаркому МОПР'у КАГАН.

Да ведама райспажыўсаюзаў, райвыканкомаў, райРСІ наступных раёнаў:
Шклоў, Насьцюковічы, Дрыса, Клічаў, Горні, Лепель, Ветка, Бушачы, Чыраванапольле, Талачын,
НА ПРАЦЯГУ ЛІПЕНЬ-КАСТРЫЧНІК
кнігарні паказаных райспажыўсаюзаў упарта не выплываюць пасылаемую літаратуру і падручнікі, не аплачваюць грошы выдавецтвам за атрыманыя кнігі, што прымушае нас спыніць адгрузку вышэйпаказаным раёнам кніг і культтавараў.
Школы знаходзяцца пад пагрозай зрыву забесьпячэньня падручнікамі і навучальнымі прыладамі.
Беларускае аб'яднаньне культтавараў просіць раённыя арганізацыі прагаваць на райспажыўсаюзы, каб апошнія наладзілі нармальную працу па абслугоўваньні спажыўцоў культтаварамі.
Нам. дырэктара БАКТ'у ЛЮБІЧ.

Беларускі філіял Дзяржаўнага інстытуту па праектавакьні га адоў пры НККГ БССР
„БЕЛДЗІПРАГАР"
Паведамляе ўсе дзяржаўныя, грамадзкія, кааперацыйныя арганізацыі, што ім прымае
складаньне і распрацоўка праектаў
па ўсіх відах жыльлёвага, ведамственага, камунальнага і іншага непрамысловага будаўніцтва:
ЖЫЛЫЯ ДАМЫ, ІНТЭРНАТЫ, ГЭСЬЦІНІЦЫ, ТЭАТРЫ, КЛЮБЫ, КІНО, ШКОЛЫ
РОЗНЫЯ ГРАМАДЗКІЯ БУДЫНКІ
БАЛЬНЫ І ЛІЧЫЛЬНЫЯ ЛЕЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ
ВАДАПРАВОДЗІНЫЯ, КАНАЛІЗАЦЫЙНЫЯ, ВАТАПІЧНЫЯ,
ПАРКІ, САДЫ, СКВЕРЫ І. Г. Д.
З заказамі зьвяртацца, Менск. Савецкая 46, 4-ты паверх.
Дзіпрагар.
Для своячасовага выкананьня праектаў і наогул работ, з заказамі трэба паспяшацца.
Дырэкцыя.

Дзяржаўны Дзяржкурсы Росьпісу
РАЗРЫСЎКІ па ўсенагі, тканінах, фарбамі, рэльефны, алейны, мазаік, пырскамі. Прысьпяшкамі: бліскучы, сікаржнуі і інш.
Спосаб: нераспыльны, алейны, прарыстэ, росьпіс мікрагэ золата, каляровага срэбра. Рэмісьленнікі, школы: пасылы, цэлюлоіда скуры, дрэва. Для лекцый прыймаюцца 300 маладых, дарэмна і гастаньні.
Уменьне малюнка не патрабуецца. Пачатак заняткаў 1-ае сьнежня. Заняткі ў месяц падвоем на дзень.
Заявы ўсылаюцца праз Гарадзкі аддзел Дзяржаўнага сацыяльнага забесьпячэньня і Гарадзкі аддзел Дзяржаўнага сацыяльнага забесьпячэньня.
Масква, вул. Дзяржынскага, д. № 1.
ЗАОЧНЫЯ КУРС